12 СТУДЗЕНЯ 2007 г.
ПЯТНІЦА
№ 7 (25872)
Кошт 400 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.
Наша газета ўключана ў «Залаты фонд прэсы» СНД

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Урады Беларусі і Расіі разглядаюць пытанні зняцця абмежаванняў ва ўзаемным гандлі

Урады Беларусі і Расіі разглядаюць пытанні зняцця абмежаванняў ва ўзаемным гандлі. Аб гэтым паведаміў журналістам у Маскве прэм'ер-міністр нашай краіны Сяргей Сідорскі.

Паводле яго слоў, усе пытанні будуць прапрацаваны, падрыхтаваны адпаведныя дакументы. Бакі павінны разгледзець увесь спектр пагадненняў паміж Беларуссю і Расіяй. У прыватнасці, гэта датычыцца пытанняў выключэнняў і абмежаванняў ва ўзаемным гандлі, увядзення пошлін у аднабаковым парадку.

Сяргей Сідорскі адзначыў, што ўвядзенне пошліны на нафту стала негатыўнай з'явай не толькі для беларускіх прадпрыемстваў, але і для расійскіх. Ён нагадаў, што Беларусь і раней купляла нафту па сусветных цэнах. Таму пасля ўвядзення Расіяй экспартных пошлін на нафту яе купля стала для беларускіх заводаў нерэнтабельнай. У сувязі з гэтым Беларуссю была прынята сіметрычная мера — увядзенне пошліны на транспарціроўку нафты па тэрыторыі рэспублікі. Як паказаў вопыт, увядзенне такой меры не садзейнічала развіццю эканомік двзюх краін.

«Урады Беларусі і Расіі будуць весці перагаворы аб тым, каб узаемныя выключэнні і абмежаванні ў гандлі былі зняты», — сказаў прэм'ер-міністр.

**Людміла САЦ, БЕЛТА.**

## НАФТА ПАЙШЛА

РУП «Гомельтранснафта Дружба» выйшла на аптымальны рэжым прапампоўвання нафты праз сістэму трубаправодаў, якія праходзяць праз тэрыторыю Беларусі. Цяпер з расійскага боку ў гадзіну паступае каля 10 тыс. тон нафты. Гэта значыць, за суткі прадпрыемства зможа прапампоўваць 230—240 тыс.тон вуглевадароднай сыравіны.

**БЕЛТА.**

Уладзімір ПАЛУЯН:

## «Газавае пытанне падатковую нагрузку не павялічыць»

Летась фінансавыя паступленні ў рэспубліканскі бюджэт па лініі падатковай службы склалі 23,7 трлн рублёў і перавысілі ўзровень 2005 года на 9,4 працэнта. Першы намеснік міністра па падатках і зборах Уладзімір Палуян заўважыў, што доля фінансавых адлічэнняў падатковых органаў у фарміраванні рэспубліканскага бюджэту складае 82,4 працэнта ад агульнай сумы ўсіх даходаў дзяржаўнай казны.

Паводле інфармацыі Уладзіміра Палуяна, у сувязі з павышэннем цэн на энерганосьбіты з Расіі даходная частка бюджэту нашай краіны можа істотна паменшыцца. Зараз ва ўрадзе актыўна распрацоўваюцца адпаведныя меры, якія будуць накіраваны на кампенсацыю даходаў, якіх краіна не атрымае па газавай праблеме. Разам з тым зрабіць гэта трэба так, каб не павялічыць агульную падатковую нагрузку на эканоміку краіны, для індывідуальных прадпрымальнікаў і насельніцтва. Больш таго, сёлетнія новаўвядзенні па спрашчэнню сістэмы падаткаабкладання дазволяць знізіць падатковую нагрузку для суб'ектаў гаспадарання нашай краіны на 0,7 працэнта.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### Прамая лінія

## УСЁ АБ ЗЯМЕЛЬНЫХ І МАЁМАСНЫХ АДНОСІНАХ

На ўсе пытанні, звязаныя з зямельнымі і маёмаснымі адносінамі, па тэме рэгістрацыі нерухомай маёмасці і механізму продажу зямельных участкаў чытачам «Звязды» адкажа **старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Георгій Іванавіч КУЗНЯЦОЎ.**

**Увага! «Прамая лінія» адбудзецца 17 СТУДЗЕНЯ з 11.00 да 12.30 па рэдакцыйных тэлефонах: (8-017) 292-38-21; 292-38-92. Папярэднія пытанні прымаюцца па тэлефону: (8-017) 287-17-51 або пісьмова. Наш адрас: рэдакцыя газеты «Звязда», 220013 г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а. «Прамая лінія».**

## Дабаўленне малака зніжае карысць гарбаты

Добры эфект уздзеяння гарбаты на сардэчна-сасудзістую сістэму страчваецца пры дабаўленні да яго малака, паведамляюць інфармагенцтвы. Да такога вываду прыйшлі нямецкія вучоныя з берлінскай бальніцы Charite Hospital пасля правядзення лабараторных эксперыментаў на тканках пацукоў, а таксама даследаванні з удзелам людзей.

Між тым гарбата з дабаўленнем малака з'яўляецца любімым напіткам англічан. Паводле статыстыкі, 98 працэнтаў жыхароў Вялікабрытаніі аддаюць перавагу менавіта такому спосабу заварвання гарбаты.

**Кар. БЕЛТА.**

ISSN 1990-763X
9 771990 763015

# АГНІ НАЧНОЙ ЗМЕНЫ



Фота Анатолія КЛЕШЧУКА.

*Нафтаперапрацоўчы завод у Мазыры працуе на поўную магутнасць.*

Генадзь НЯВЫГЛАС:

## «У Беларусі трэба стварыць простыя і зразумелыя ўмовы для вырашэння праблем грамадзян»

Аб гэтым заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на пашыраным пасяджэнні калегіі Адміністрацыі. Пасяджэнне прысвечана пытанню арганізацыі работы дзяржаўных органаў, іншых дзяржарганізацый з грамадзянамі па заяўнаму прынцыпу «аднаго акна».

Генадзь Нявыглас падкрэсліў: «Дэвізам гэтай пяцігодкі аб'яўлена пабудова дзяржавы для народа. Але мы ніколі не вырашым гэту задачу ў поўнай меры, калі не ліквідуем бюракратызм. Можна павысіць эканамічны патэнцыял краіны, пастаянна павялічваць зарплаты, стыпендыі і пенсіі, запоўніць паліцы магазінаў рознымі таварамі. Але ўсе намаганні дзяржавы будуць зведзены на нішто, калі чалавек будзе вымушаны месяцамі абходжваць шматлікія кабінеты для таго, каб атрымаць элементарную даведку. Або не зможа трапіць на прыём да адпаведнага дзяржслужачага, або ў магазіне, хімчыстцы сутыкнецца з хамствам і раўнадушшам».

Сістэма «аднаго акна» ў Беларусі дзейнічае фармальна, дасягнутыя станоўчыя вынікі мінімальныя, адмоўных момантаў значна больш. Аб гэтым сведчаць матэрыялы праверак, праведзеных Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Камітэтам дзяржаўнага кантролю па ўсёй рэспубліцы, паведаміў Генадзь Нявыглас.

«У шэрагу арганізацый нікага «аднаго акна», па сутнасці, няма, — канстатаваў Генадзь Нявыглас. — Як адпраўлялі чыноўнікі на месцах грамадзян у пахoд за даведкамі, так і адпраўляюць, як патрабавалі ад іх вялікую колькасць дакументаў, так і патрабуюць». Напрыклад, работнікі аддзела адукацыі Мінскага райвыканкама лічаць, што для выдачы дубліката дакумента аб адукацыі акрамя пераліку, устаноўленага ўказам № 152, яны паводле свайго меркавання могуць запатрабаваць ад грамадзян копію працоўнай кніжкі, дакумент аб звароце ў міліцыю і іншыя. Інакш як самавольствам гэта назваць нельга. Такія факты, лічыць кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта, недапушчальныя.

Павышэнне больш як удвая цаны на прыродны газ, які пастаўляецца ў Беларусь з Расіі, не акажа значнага ўплыву на рост камунальных плацяжоў для насельніцтва, паведаміў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Генадзь Нявыглас.

Паводле яго слоў, рост тарыфаў адбудзецца ў рамках тых $5, аб якіх гаварылі раней. У той жа час Генадзь Нявыглас падкрэсліў, што асноўная нагрузка ад павышэння цэн на энерганосьбіты ляжа на прамысловыя прадпрыемствы, у работу якіх неабходна будзе ўнесці значныя карэктывы.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта паведаміў, што ўрад цяпер распрацоўвае шэраг мераў па скарачэнню энергаёмістасці вытворчасцяў і эканоміі энергарэсурсаў. Паводле слоў Генадзя Нявыгласа, гэта будзе сур'ёзнае выпрабаванне для беларускай эканомікі. Але разлікі спецыялістаў паказваюць, што вытрымаць яго — цалкам рэальная задача.

**Кар. БЕЛТА.**

Уладзімір КАНАПЛЁЎ:

## «БУДАЎНІЦТВА САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ — ПРАЦЭС НЕЗВАРОТНЫ»

Абвастрэнне ў адносінах Расіі і Беларусі не павінна паставіць пад пагрозу стварэнне Саюзнай дзяржавы. Аб гэтым заявіў у эксклюзіўным інтэрв'ю карэспандэнту БЕЛТА старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Канаплёў.

На яго думку, гэта ўжо незваротны працэс, які ініцыіраваны нашымі народамі, і праблемы гандлёва-эканамічнага характару, існуючыя на сённяшні дзень, ніякім чынам не павінны стаць перашкодай у інтэграцыі дзвюх краін. «Гэта разумеюць як кіраўніцтва, так і палітыкі абедзвюх дзяржаў, якія не ставяць пад сумненне неабходнасць дасягнення гэтай мэты», — падкрэсліў Уладзімір Канаплёў.

Усе існуючыя праблемы сёння вырашаюцца цывілізаваным перагаворным шляхам. Такім чынам зняты пытанні, што датычацца цэн на газ. «Упэўнены, што кампраміс будзе знойдзены і па іншых», — адзначыў ён.

Што датычыцца будучыні Саюзнай дзяржавы, то яе будаўніцтва ідзе згодна з зацверджаным планам, і ўжо нямала зроблена, каб гэты саюз набыў рэальную сілу. Праект Канстытуцыйнага акта Саюзнай дзяржавы цалкам падрыхтаваны і яго прыняцце — толькі справа часу, адзначыў Уладзімір Канаплёў.

### Ва ўрадзе

## «Белнафтахім» у 2007 годзе забяспечыць пастаўку на АЗС агульнага карыстання дызпаліва Еўра-4

Канцэрн «Белнафтахім» у другім квартале 2007 года забяспечыць вытворчасць і пастаўку на АЗС агульнага карыстання дызельнага паліва для запраўкі аўтамабіляў, адпаведнага патрабаванням Еўра-4. А ў трэцім квартале 2009 года на аўтазаправачных станцыі будзе паступаць дызпаліва ўзроўню Еўра-5.

Як паведамілі БЕЛТА ў Апараце Саўміна, пастановай урада № 1804 ад 31 снежня 2006 года зацверджаны комплекс мераў па забеспячэнню эксплуатацыі ў рэспубліцы аўтамабіляў з рухавікамі Еўра-4 і Еўра-5.

Канцэрну «Белнафтахім» даручана ў другім квартале 2007 года стварыць на аўтазаправачных станцыях умовы для рэалізацыі рэагенту AdBlue для запраўкі аўтамабіляў.

У далейшым плануецца вывучэнне тэхналогіі вытворчасці AdBlue, што выкарыстоўваецца ў краінах Заходняй Еўропы для змяншэння выкідаў шкодных рэчываў у адпрацаваных газах аўтамабіляў, а таксама вопыту работы кампаній, якія ажыццяўляюць пастаўку сістэм для захоўвання і запраўкі рэагенту. У 2008 годзе будуць падрыхтаваны прапановы аб магчымасці вытворчасці ў рэспубліцы рэагенту AdBlue.

Акрамя таго, у першым квартале 2007 года канцэрн «Белнафтахім» унясе прапановы аб мерах эканамічнага стымулявання вытворчасці экалагічна чыстага дызельнага паліва на нафтаперапрацоўчых заводах Беларусі.

Нагадаем, што беларускімі НПЗ ужо асвоены выпуск дызпаліва ў адпаведнасці са стандартам Еўра-4.

**Мілена АНУФРЫЁНАК, БЕЛТА.**

## Расія адмяніла для беларусаў абавязковае афармленне часовага ўвозу аўтатранспарту на граніцы

Расійскія мытнікі сёння атрымалі распараджэнне не патрабаваць ад беларускіх грамадзян пры перасячэнні беларуска-расійскай граніцы абавязковага афармлення часовага ўвозу аўтатранспарту.

Аб гэтым паведамілі супрацоўнікі аддзела мытнага афармлення і мытнага кантролю № 6 «Рудня» Цэнтральнага мытнага ўпраўлення Смаленскай мытні. Такім чынам, грамадзяне Беларусі на асабістых аўтамабілях могуць перасякаць граніцу Расійскай Федэрацыі так, як гэта было да 1 студзеня 2007 года. Нагадаем, з 1 студзеня 2007 года Расія ўвяла абавязковае афармленне пасведчання на часовы ўвоз транспартнага сродку пры перасячэнні беларуска-расійскай граніцы, што прывяло да скопішча аўтатранспарту на мытных і аўтамабільных пераходах.

**Дзіяна КУРЫЛА, БЕЛТА.**

# «Дзеянні манаполій нельга атаясамліваць з воляй расіян»

**У час нялёгкіх перамоў з Масквой па пастаўках энерганосьбітаў шэраг грамадскіх арганізацый нашых краін выступілі ў падтрымку беларускага народа.**

Расійска-беларускі грамадскі саюз «Братэрства», у які ўваходзяць разнастайныя грамадскія аб'яднанні Расіі, у сваім звароце да Прэзідэнта Беларусі выказалі рашучае абурэнне дзеяннямі ААТ «Газпрам» у адносінах да паставак расійскага газу ў Рэспубліку Беларусь. «Напярэдадні Новага года кіраўніцтва «Газпрама» вырашыла падвергнуць жудаснаму прыніжэнню беларускі народ, вымушаючы купляць расійскі газ па непрымальных для Беларусі цэнах», — гаворыцца ў заяве. На думку «Братэрства», такое рашэнне — гэта спроба ўнесці раскол у будаўніцтва Саюзнай дзяржавы. Тым не менш дзеянні «Газпрама» ні ў якім разе нельга атаясамліваць з воляй усяго рускага народа. «Расія, у асобе яе шматнацыянальнага народа, не мае ніякіх адносінаў да рабаўніцкіх і прыніжаючых годнасць рашэнняў ААТ «Газпрам», — гаворыцца ў заяве. Расіяне добра памятаюць, хто прыняў першы ўдар нямецка-фашысцкіх захопнікаў на заходніх рубяжах нашай Радзімы. А сёння Рэспубліка Беларусь прымушаецца да закупкі газу па цане, прызначанай для Германіі!

У адкрытым пісьме ўраду Расіі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, члены грамадскай арганізацыі «Ваенна-навуковае таварыства» да глыбіні душы абураны мерамі, якія ў адносінах да нашай краіны прымаюць расійскія алігархі. На думку ветэранаў, ураду Расіі даўно пара выкарыстаць уладу, якой надзяліў яе народ, і запатрабаваць спыніць рабаванне абароненага ўдзельнікамі ВАВ, расіянамі і беларусамі, народнага багацця, вярнуць нетры народу. Сівавалосыя салдаты Перамогі выказваюць ганьбу кіраўніцтву Расіі, якое дазволіла шантаж і ціск на Беларусь.

У заяве Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «За Саюз і камуністычную партыю Саюза» адзначаецца, што калі раней асобныя кіраўнікі Расіі ўсімі спосабамі тармазілі рэалізацыю Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, то сваімі апошнімі антыбеларускімі і антысаюзнымі дзеяннямі яны сталі на шлях яе фактычнай ліквідацыі. Такім чынам, Беларусь апынулася пад двайным ударам, з Захаду і з Усходу, мэта якога — стварыць у рэспубліцы эканамічны крызіс і сацыяльную напружанасць, і, як вынік, прымусіць Беларусь праводзіць навязаную Захадам палітыку.

Члены аб'яднання заклікаюць грамадскасць Расіі адэкватна адрэагаваць на паводзіны расійскіх манаполій і ўрада ў адносінах да саюзнай Беларусі. Менавіта народ Расіі мае правы вызначаць, каму павінны служыць расійскі ўрад і манаполіі: заакіянскаму дзядзьку, уласнай машне ці ўсё ж такі народу Расіі і яе Саюзнай дзяржаве з Беларуссю.

**Уладзімір АЛЯКСАНДРАЎ.**

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

***Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.01.2007 г. (для б/н разлікаў)***

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 140,00 |
| 1 еўра | 2 775,47 |
| 1 латвійскі лат | 3 976,22 |
| 1 літоўскі літ | 803,65 |
| 1 чэшская крона | 100,12 |
| 1 польскі злоты | 715,22 |
| 1 расійскі рубель | 80,66 |
| 1 украінская грыўня | 423,72 |

***Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў***

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 26,5320 |
| 10 UAH | 52,4960 |
| 1000 BYR | 12,3849 |
| EUR | 34,3828 |

***Курс у гандлёвых кампаніях (на 11.01.2007)***

| | |
|---|---|
| USD | 2210 / 2320 |

**Агенцтва Уладзіміра Граўцова**

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

## Аграгарадкі набудуць афіцыйны статус

**У мінулым годзе ў Беларусі было створана 249 аграгарадкоў. Як паведаміў начальнік аддзела ўпраўлення па інвестыцыях і будаўніцтву Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Сяргей Голікаў, сёлета іх плануецца ўвесці 253.**

Спецыялістамі Мінсельгасхарча распрацаваны праект нарматыўнага акта аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон «Аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле». Папраўкі датычацца афармлення афіцыйнага статусу аграгарадка. Як адзначыў Сяргей Голікаў, дасюль не было зроблена дакладнага вызначэння гэтай адміністрацыйнай адзінкі. У праекце закона пад аграгарадком разумеецца добраўпарадкаваны населены пункт з колькасцю насельніцтва да 300 чалавек, дзе створаны належныя ўмовы ў межах сацыяльных стандартаў.

Дарэчы, гэтыя дзяржаўныя нормы раней былі вызначаны з разліку на тысячу жыхароў. Таму, як заўважыў Сяргей Голікаў, распрацаваны прыкладны пералік нарматываў сацыяльных стандартаў у дачыненні да аграгарадкоў. Гэты дакумент унесены на разгляд ва ўрад, а праект закона знаходзіцца ў Палаце прадстаўнікоў. Калі ўсе папраўкі будуць прынятыя, то ў Беларусі з'явіцца новая адміністрацыйная адзінка са «своімі» стандартамі.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

## Сацыяльныя ўстановы пашырацца. І палепшаць інфраструктуру

**На 2007 год запланаваны ўвод у эксплуатацыю пяці аб'ектаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, у тым ліку двух — рэспубліканскай і трох — камунальнай уласнасці.**

У прыватнасці, гаворка ідзе аб рэканструкцыі з пашырэннем да 150 месцаў санаторыя для ветэранаў вайны, працы і інвалідаў «Ясельда» ў Пінскім раёне, рэканструкцыі медыка-адміністрацыйнага корпуса Рэспубліканскага інтэрната ветэранаў вайны і працы пад Мінскам, рэканструкцыі Веснаўскага дома-інтэрната ў Глускім раёне, пральні ў спецшколе-інтэрнаце для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў Рэчыцы і рэканструкцыі медыцынскага корпуса Іўянецкага дома-інтэрната для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця на Валожыншчыне.

Апроч таго, як паведаміла кансультант аддзела ўстаноў сацыяльнага абслугоўвання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алена Булынка, будуць весціся работы на яшчэ 8 аб'ектах рэспубліканскай і камунальнай уласнасці. Сёлета вызначана другая чарга будаўніцтва санаторыя для інвалідаў і пенсіянераў «Белая Вежа», рэканструкцыя лячэбнага корпуса санаторыя «Бярэзіна», корпуса сацыяльнай рэабілітацыі і галаўнога корпуса Беларускага пратэзна-артапедычнага аднаўленчага цэнтра, лячэбнага корпуса аздараўленчага комплексу для інвалідаў ва ўрочышчы Вяжуці, рэканструкцыя медыцынскага корпуса Чэрвеньскага інтэрната для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, а таксама рэканструкцыя падобных устаноў у Багушэўску і вёсцы Васілішкі Шчучынскага раёна.

Летась у вызначаныя тэрміны былі праведзены рэканструкцыі псіханеўралагічных дамоў-інтэрнатаў у вёсках Сялюта Віцебскага і Капцэвічы Петрыкаўскага раёнаў, санаторыя «Ясельда», уведзена ў эксплуатацыю водагразелячэбніца ў санаторыі «Бярэзіна» і артэзіянская свідравіна на тэрыторыі Рэспубліканскага дома-інтэрната ветэранаў вайны і працы.

**Сяргей ГРЫБ.**

**Вниманию владельцев акций ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»**

**ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»** сообщает, что 14 февраля 2007 г. по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 8 состоится очередное Общее Собрание акционеров ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»

с повесткой дня:

- об итогах работы ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» за 2006 год и Программе его развития на 2007 год;
- о результатах ревизии Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» за 2006 год;
-о результатах внешней аудиторской проверки бухгалтерской отчетности ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» за 2006 год;
- о распределении прибыли ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» за 2006 год;
- об утверждении нормативов отчислений от прибыли на 2007 год;
- об установлении размера и периодичности выплаты дивидендов по привилегированным акциям ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»;
-об увеличении уставного фонда ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»;
- о внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»;
- об избрании членов Наблюдательного Совета и Ревизионной комиссии ОАО «Белорусский Индустриальный Банк».

Начало собрания — 11.00.

Начало регистрации лиц, имеющих право на участие в собрании — 10.30 при предъявлении документов, подтверждающих личность и полномочия представителя.

Информацию по вопросам повестки дня лица, имеющие право на участие в собрании, могут получить по месту нахождения головного офиса ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» и филиалов при предъявлении документов, подтверждающих личность и полномочия представителя.

Адреса головного офиса и филиалов:

**г. Минск, ул. Мельникайте, 8;**
**г. Минск, ул.Энгельса, 30;**
**г. Витебск, ул. Правды, 8-а;**
**г. Гомель, ул. Головацкого, 19;**
**г. Гродно, бульвар Ленинского комсомола, 7а;**
**г. Могилев, пер. Комиссариатский, 5-а.**

**Наблюдательный Совет ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»**

## Паведамленне Упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Рэспублікі Беларусь

Учора раніцай у Лоеўскі РАУС звярнулася мясцовая жыхарка з заявай аб згвалтаванні. Сярод прадстаўленых фотатабліц пацярпелая апазнала маркуемага злачынцу. Ім аказаўся Грышчанка Аляксандр Уладзіміравіч, 1979 г.н., ураджэнец г. Гомель, жыхар п.г.т. Лоеў Гомельскай вобласці, раней неадназаразова судзімы за цяжкія злачынствы. Да месца жыхарства зламысніка неадкладна выехала група затрымання...

Злачынца напаў на супрацоўніка крымінальнага вышуку са спіны, нанёс апошняму тры нажавыя раненні і ўцёк. Работнік міліцыі дастаўлены ў раённую бальніцу. На тэрыторыі рэспублікі ўведзены спецыяльны план па вышуку злачынцы. Адпаведныя арыенціроўкі накіраваны ва ўсе органы ўнутраных спраў Беларусі, а таксама ў міліцэйскія падраздзяленні Чарнігаўскай вобласці (Украіна), з якой мяжуе Лоеўскі раён. Апавешчаны прадстаўнікі пагранвойскаў. Да месца злачынства выбыў начальнік УУС Гомельскага аблвыканкама і аператыўныя работнікі аблупраўлення.



**Просім грамадзян, якім вядома аб магчымым месцазнаходжанні злачынцы, паведаміць у бліжэйшае аддзяленне міліцыі або па тэлефонах у Гомелі: 8 (0232) 711-328, 711-062, а таксама па тэлефону 02.**

*Яго прыметы: на выгляд 27—29 гадоў, хударлявага целаскладу, рост 178—180 см, твар выцягнуты, скуласты, нос з гарбінкай, губы тонкія, валасы русыя, стрыжка кароткая, на руцэ маецца татуіроўка ў выглядзе пяці кропак.* Быў апрануты: куртка з балонні чорнага колеру, штаны цёмнага колеру, шапка спартыўнага тыпу, вязаная, цёмнага колеру.

Ананімнасць паведамлення і ўзнагарода за прадстаўленую інфармацыю гарантуецца.

**УВАГА!**

## ШТАРМАВЫЯ ВЯТРЫ — ДРУГІ ДЗЕНЬ ЗАПАР

**Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» спецыялісты Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды, моцны глыбокі цыклон з боку Цэнтральнай Балтыкі прынёс учора да нас узмацненне ветру да штармавых пакязчыкаў — 15—20 м/сек. 11 студзеня на працягу дня ў Мінску быў вецер 16—20 м/сек, а ў Мінскім раёне на станцыі Калодзішчы зафіксавана 21—24 м/сек; вецер да 24 м/сек назіраўся на станцыях Ашмяны і Навагрудак.**

Сёння штармавы моцны парывісты вецер —15—20 м/сек — захавае сваю моц галоўным чынам у паўночнай частцы рэспублікі. Будзьце ўважлівыя і асцярожныя! Бацькам у такое надвор'е лепш пакінуць сваіх дзетак дома і не выпускаць гуляць самастойна на двор.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## 54 РАЁНЫ БЕЛАРУСІ ПАЦЯРПЕЛІ АД СТЫХІІ



Фота БелТА.

**Моцны вецер, што гаспадарыў учора ў Беларусі, нарабіў бяды ў 54 раёнах рэспублікі, паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь Навіцкі.**

Паводле папярэдняй інфармацыі, амаль на ўсёй тэрыторыі краіны, акрамя Гомельскай вобласці, панавалі вятры: у выніку разгулу стыхіі былі пашкоджаны 29 жылых дамоў, 103 сельскагаспадарчыя пабудовы — з іх 60 фермаў, абясточана 680 населеных пунктаў (найбольш пацярпелі Мінская і Віцебская вобласці). На шчасце, зноў-такі паводле папярэдніх даных, абышлося без ахвяр. Для ліквідацыі наступстваў ураганнага ветру былі прыцягнуты больш за 600 чалавек і 166 адзінак тэхнікі. Да таго ж на месцах створаны абласныя і раённыя камісіі па надзвычайных сітуацыях, якія вызначаюць нанесены ўрон і аказваюць дапамогу пацярпелым. Тым больш што сёння днём стыхія рыхтуе новы ўдар.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ВЫПУШЧАНЫ НОВЫЯ МАНЕТЫ



**Нацыянальны банк сёння ўводзіць у абарачэнне памятныя манеты «Беларусь—Кітай».**

15 гадоў дыпламатычных адносінаў», паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні інфармацыі галоўнага банка краіны. Залатыя манеты маюць намінал 100 рублёў, пробу сплаву 900, масу 17,28 г, срэбныя выпушчаны наміналам 20 рублёў, пробай сплаву 925, масай 33,63 г, медна-нікелевыя — 1 рубель. Залатыя і срэбныя манеты адчаканены якасцю «пруф», медна-нікелевыя — «пруф-лайк». Тыраж залатых манет — 1000 штук, срэбных — 2000 штук, медна-нікелевых — 3000 штук.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## УВОДЗЯЦЦА НОВЫЯ ЗАКУПАЧНЫЯ ЦЭНЫ НА СЕЛЬГАСПРАДУКЦЫЮ

**У краіне павялічваюцца закупачныя цэны на малако, парасят і буйную рагатую жывёлу, якія набываюцца ў сельгасвытворцаў для прамысловай перапрацоўкі. Яны датычацца як прадпрыемстваў, так і насельніцтва, паведамілі рэдакцыі ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання.**

Закупачныя цэны на малако павялічваюцца ў сярэднім на 5 працэнтаў. Так, малако вышэйшага гатунку будуць прымаць па 410 тысяч рублёў за тону, першага гатунку — па 382 тысячы, другога — па 245 тысяч рублёў. Нагадаем, што апошні раз закупачныя цэны на гэты від сельскагаспадарчай прадукцыі павялічваліся ажно ў пачатку сакавіка 2006 года.

Закупачныя цэны на парасят датычацца толькі першай і другой катэгорыі — зараз яны складуць адпаведна 3 мільёны 473 тысячы і 3 мільёны 358 тысяч рублёў за тону. На астатнія катэгорыі яны, як паведамілі нам у міністэрстве, не павялічваліся. Закупачныя цэны на буйную рагатую жывёлу змяніліся ў бок павелічэння на 10 працэнтаў. У прыватнасці, маладняк вагой 400 кілаграмаў і больш цяпер будзе прымацца ад сельгасвытворцаў па 2 мільёны 923 тысячы рублёў за тону, дарослая буйная жывёла вышэйшай укормленасці — па 2 мільёны 360 тысяч, маладняк вагой ад 350 да 399 кілаграмаў — па 2 мільёны 700 тысяч рублёў за тону. У адрозненне ад закупачных цэн на малако, закупачныя цэны на парасят і буйную рагатую жывёлу апошні раз павялічваліся ў жніўні мінулага года. Аднак, нягледзячы на гэта, як пракаментавалі нам у Мінсельгасхарчы, усё роўна ў цэлым узнікла неабходнасць іх павелічэння зараз. Гэтая мера дазволіць хоць бы часткова кампенсаваць выдаткі па вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ВЕНЕРОЛАГІ ДЗЯЖУРАЦЬ... У РЭСТАРАНАХ

**У віцебскіх рэстаранах, клубах былі арганізаваны так званыя «пасты», і ў якасці «дзяжурных» выступаюць спецыялісты Віцебскага абласнога скурна-венерычнага дыспансэра.**

Медыкі бясплатна прапануюць адпачываючым брашуры, дзе выкладзена інфармацыя аб «інтымных» захворваннях, метадах прафілактыкі, надрукаваны кантактныя тэлефоны падраздзяленняў медыцынскай установы... Жадаючым прапаноўваецца ў падарунак прэзерватывы.

На думку спецыялістаў, такая форма работы вельмі эфектыўная. Менавіта ў такіх месцах адпачынку завязваюцца паміж мужчынамі і жанчынамі новыя знаёмствы, а потым... Галоўнае, што такі «шлях у народ» з боку медыкаў добра інфармуе грамадзян на самых распаўсюджаных пытаннях прафілактыкі скурна-венерычных захворванняў. І дзеля гэтага нікуды хадзіць не трэба: «пракансультуюць прама на месцы»...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь нагадвае аб тым, што падатковая дэкларацыя (разлік) аб сукупным даходзе за 2006 год прадстаўляецца не пазней за 1 сакавіка 2007 года.**

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

12
СТУДЗЕНЯ 2007 г.
ПЯТНІЦА
№ 2 (15453)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Ходзяць чуткі, што...

# ...на ЦТ можна будзе здаваць чатыры дысцыпліны

**Як вядома, пасля адмены ў краіне платнага цэнтралізаванага тэсціравання абітурыентам пакінулі магчымасць здаваць на бюджэтным цэнтралізаваным тэсціраванні ўсяго тры вучэбныя дысцыпліны. Пры гэтым абітурыенты сярэдніх спецыяльных навучальных установаў аказаліся ў больш выйгрышным становішчы ў параўнанні з абітурыентамі ВНУ.**

Уступны іспыт па адной з двух дзяржаўных моў з'яўляецца абавязковым для ўсіх. А вось з двух іншых сертыфікатаў, скажам, па матэматыцы ці фізіцы, яны маглі выбіраць лепшы для сабе, і арыентуючыся менавіта на гэту вучэбную дысцыпліну, шукаць адпаведную спецыяльнасць. У абітурыентаў ВНУ такой магчымасці не было. Асабліва крыўдна, калі на родных спецыяльнасцях аднаго факультэта ў пераліку экзаменаў не супадае толькі адна вучэбная дысцыпліна. Яшчэ адзін сертыфікат у запасе пакінуў бы маладым людзям магчымасць для пэўных манёўраў. Абітурыенты нават гатовыя былі за чацвёртае тэсціраванне заплаціць. Напрыканцы мінулага года папаўзлі чуткі, што сёлета маладым людзям прадаставяць такую магчымасць. Нашы чытачы, якія звярнуліся ў газету, пачулі гэту «навіну» ад сваіх школьных настаўнікаў...

— На жаль, але я не магу нічым парадаваць будучых абітурыентаў, — паведаміў карэспандэнту «Звязды» дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай Фяськоў. — У Правілы прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы не ўносілася ніякіх змяненняў. Таму, як і летась, прайсці цэнтралізаванае тэсціраванне можна будзе толькі па трох вучэбных дысцыплінах. Згодна з Правіламі прыёму ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, абітурыенты ССНУ павінны праходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне па дзвюх вучэбных дысцыплінах. Але на практыцы «адсеяць» абітурыентаў ССНУ ад абітурыентаў ВНУ немагчыма. Да таго ж многія маладыя людзі пасля няўдалай спробы паступлення ў ВНУ падаюць свае дакументы ў прыёмных камісіі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Мы не можам пазбаўляць іх такога права яшчэ на стадыі рэгістрацыі для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні.

Зразумела, было б вельмі добра, калі б у абітурыентаў ВНУ быў дадатковы шанц. Але ад нас прынцыпова такога рашэння не залежыць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# БУДЗЬ АКТЫЎНЫМ!

**25 курсантаў ваеннага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы аднымі з першых датэрмінова прагаласавалі на выбарчым участку № 67 у горадзе на Нёмане.**

Трынаццаць з іх галасавалі ўпершыню. Дазвол на датэрміновае галасаванне яны атрымалі ў сувязі з тым, што з 14 студзеня пачынаюцца канікулы і ўжо напярэдадні выбараў большасць курсантаў хочуць пакінуць горад.

***НА ЗДЫМКУ: у Гродне аднымі з першых датэрмінова прагаласавалі 25 курсантаў.***



Фота Леаніда ШЧАГЛОВА, БЕЛТА.

* * *

Напярэдадні выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў 25-га склікання праходзіць акцыя-марафон Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі — «Моладзь выбірае!». Яе галоўная мэта — павысіць цікаўнасць маладых да працэсаў, што адбываюцца ў сферы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, а значыць, і заахвоціць узяць удзел у выбарах. З 10 па 14 студзеня ладзіцца шэраг акцый: "Твой голас — будучае краіны!", «Маладзёжны рэзерв», «Усе на выбары, сябры, бо інакш жыць нельга!». Такім чынам, не толькі арганізуецца праца з членамі БРСМ, але і рэалізоўваецца дзяржаўная маладзёжная палітыка.

**Ірына ЗАГОРСКАЯ.**

# ЭКСПАРТ АДУКАЦЫІ

## Якасць адукацыі, камфортнасць пражывання і бяспечнасць — галоўныя крытэрыі пры выбары краіны навучання

**Да 2010 года колькасць замежных грамадзян, якія атрымліваюць адукацыю ў Беларусі, павінна павялічыцца да 16 тысяч чалавек. Праграмай развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі прадугледжваецца штогадовае павелічэнне колькасці замежных студэнтаў у вышэйшых навучальных установах на 20 працэнтаў. Сёння адукацыйныя паслугі замежным грамадзянам прадастаўляюць 44 дзяржаўныя ВНУ, 7 ВНУ прыватнай формы ўласнасці, а таксама некаторыя сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. У гэтым навучальным годзе ў вышэйшых навучальных установах навучаюцца 5543 замежныя грамадзяніны з 70 краін свету, з іх 746 чалавек праходзяць даўніверсітэцкую падрыхтоўку. Праўда, пакуль што прасоўванне беларускімі ВНУ адукацыйных паслуг на міжнародны рынак носіць даволі прымітыўны характар. Аб гэтым гаварыла на калегіі, прысвечанай пытанням удасканалення сістэмы навучання замежных грамадзян, намеснік міністра адукацыі нашай краіны Таццяна КАВАЛЁВА.**

Для прыкладу, у 2006 годзе толькі лічаныя ВНУ, такія, як Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, БДМУ, Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт і БНТУ, якія і раней сістэмна займаліся прыцягненнем на вучобу замежных грамадзян, змаглі павялічыць сярод студэнтаў колькасць іншаземцаў. У Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце на розныя формы навучання былі залічаны 365 замежных грамадзян, што ў 2,8 раза перавышае набор 2005 года.

***(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)***

# Настаўніцы ўмеюць усё

**Настаўніцы, аказваецца, умеюць складаць вершы, дэкламаваць іх са сцэны, спяваць, танцаваць і нават рэжысіраваць невялічкія сцэнічныя пастаноўкі! Усё гэта выявіла намінацыя «Настаўнік» у межах конкурсу прафесійнага майстэрства «Сталічны настаўнік — сталічнай адукацыі 2007» Цэнтральнага раёна сталіцы.**

У фінал, а значыць, і на гарадскі этап конкурсу выйшлі самыя смелыя, здольныя змагацца за перамогу і на больш высокіх узроўнях — Таццяна Кулік, настаўніца рускай мовы і літаратуры гімназіі-каледжа № 24, Юлія Стырна, настаўніца гісторыі педагагічнай гімназіі № 3, Вольга Куніна, настаўніца французскай мовы СШ № 79 і Аксана Мукасей, настаўніца беларускай мовы і літаратуры СШ № 48. Таццяну Кулік адзначыла і дзіцячае журы, а Вольга Куніна атрымала ў дадатак ад прафесійнага журы тытул «Міс Чароўнасць».

Паводле слоў начальніка аддзела дашкольнай і школьнай адукацыі ўпраўлення адукацыі Адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Мінска Аляўціны Гладкай, зараз вельмі важна павярнуцца да асобы педагога, якому ёсць чым падзяліцца з калегамі — сваім асабістым вопытам у выхаванні дзяцей, новым словам у працэсе навучання. Акрамя таго, «нам хацелася б, каб на гарадскім узроўні палма першынства была за настаўнікамі Цэнтральнага раёна».

Конкурс «Сталічны настаўнік — сталічнай адукацыі» штогод праходзіць сярод педагагічных работнікаў першай і вышэйшай катэгорый дзяржаўных і прыватных устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі. Вылучаюцца чатыры этапы: на ўзроўні агульнаадукацыйных устаноў, пасля — раённы, гарадскі і рэспубліканскі. Раённы этап у сваю чаргу праходзіць у тры туры. Падчас першага ўдзельніцы спаборніцтва прадстаўляюць сябе — рыхтуюць своеасаблівую творчую візітку, падвяргаюцца педагагічнаму і псіхалагічнаму тэсціраванню. Другі тур — гэта правядзенне ўрока ў незнаёмым класе і абарона творчай работы, свайго педагагічнага вопыту, сістэмы работы. Па выніках гэтага тура ў фінал конкурсу Цэнтральнага раёна выйшлі сямёра настаўніц, а пераможцамі сталі, як было сказана вышэй, чацвёра. Сярод іх — 29-гадовая Аксана Мукасей, настаўніца беларускай мовы і літаратуры СШ № 48. Дарэчы, колішняе захапленне Аксаны Сяргеёўны беларускай мовай зарадзілася, можна сказаць, насуперак лёсу, паколькі дзеці ваеннаслужачых вызваляліся ў савецкія часы ад беларускіх урокаў. Тым не менш цяпер Аксана не проста з задавальненнем выкладае свой прадмет, але вядзе факультатыўныя заняткі па тэме «Лексічныя сродкі экспрэсіі ў мове мастацкага стылю», арганізуе сёлетнія мерапрыемствы, прысвечаныя 125-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа і Янкі Купалы, а таксама цудоўна чытае са сцэны беларускія вершы, танцуе вальс, выхоўвае разам з любімым мужам сына Юрыя, вучня другога класа.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# На Міншчыне адкрылася першае аддзяленне сацыяльнай адаптацыі выпускнікоў інтэрнатных устаноў

**У Мінскай вобласці адкрылася першае ў рэгіёне аддзяленне сацыяльнай адаптацыі выпускнікоў інтэрнатных устаноў з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Яно функцыянуе са студзеня гэтага года ў структуры Маладзечанскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, паведаміла начальнік аддзела адраснай сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання камітэта па працы і сацабароне Мінскага аблвыканкама Вера Карэлава.**

Яна адзначыла, што ў бягучым годзе адкрыццё такога ж аддзялення запланавана ў Салігорску. Тут прадугледжваецца і стварэнне ўмоў для часовага начлегу выпускнікоў інтэрнатных устаноў, якія не маюць жылля і работы. У 2009 годзе аддзяленне сацыяльнай адаптацыі з'явіцца ў Мядзеле.

Паводле слоў спецыяліста, у Мінскай вобласці на 1 студзеня 2007 года на ўліку ў цэнтрах сацабслугоўвання стаялі 1 тыс. 722 выпускнікі інтэрнатных устаноў ва ўзросце ад 18 да 23 гадоў. Патрэба ў стварэнні аддзяленняў сацыяльнай адаптацыі гэтай катэгорыі асабліва вялікая ў буйных гарадах, дзе налічваецца вялікая колькасць дзяцей-сірот, якія дасягнулі паўналецця.

У Мінскай вобласці сістэма постінтэрнатнай адаптацыі дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, ва ўзросце ад 18 да 23 гадоў развіваецца дастаткова актыўна. Сфарміраваны і падтрымліваецца ў актуальным стане банк даных на выпускнікоў інтэрнатных устаноў.

Як вядома, у Беларусі дзеці-сіроты да дасягнення паўналецця знаходзяцца пад пастаянным кантролем адпаведных дзяржаўных органаў. «А потым выпускнікі ПТВ, ССНУ і ВНУ, юнакі пасля службы ў арміі, беспрацоўныя, а таксама вызваленыя з месц пазбаўлення волі фактычна «выпадалі» з-пад апекі дзяржавы, — сказала спецыяліст. — Як паказвае практыка, такія маладыя людзі звядваюць нямала складанасцей, маюць патрэбу ў дадатковых сацыяльных гарантыях. Таму галоўная задача постінтэрнатнай адаптацыі — аказанне дапамогі выпускнікам інтэрнатных устаноў ва ўсіх сферах жыцця».

Ім выдзяляецца матэрыяльная і гуманітарная дапамога, аказваюцца юрыдычныя, консультацыйныя і псіхалагічныя паслугі. Яшчэ адзін важны напрамак постінтэрнатнай адаптацыі — падтрымка ў атрыманні прафесійнай падрыхтоўкі.

**Алена ПРУС, БЕЛТА.**

# 19—20 студзеня пройдзе VII музычны фестываль «Заслаўе-2007»

**Арганізатарамі гэтага мерапрыемства выступілі Нацыянальны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста краіны прафесара Міхаіла Фінберга, Мінскі аблвыканкам і райвыканкам, а таксама Заслаўскі гарсавет.**

Гэтым музычным форумам аркестр Міхаіла Фінберга адкрые серыю фестываляў у невялікіх гарадах Беларусі ў 2007 годзе. Спецыяльна для фестывалю ў Заслаўі калектывы аркестра падрыхтавалі праграму, прысвечаную 200-годдзю з дня нараджэння выдатнага дзеяча беларускай культуры і мастацтва Напалеона Орды. У канцэртах прагучаць творы Фрыдэрыка Шапэна, Ферэнца Ліста, Фелікса Мендэльсона, Аляксандра Аляб'ева, Пятра Чайкоўскага. «Усе папярэднія фестывалі мелі вялікі поспех у жыхароў Заслаўя і Мінскай вобласці», — адзначыў Міхаіл Фінберг.

У праграму фестывалю ўключана таксама творчая сустрэча Міхаіла Фінберга з заслаўчанамі, канцэрт выхаванцаў Заслаўскай дзіцячай школы мастацтваў, выступленне Дзяржаўнага камернага хору Беларусі, аркестра народных інструментаў Магілёўскай абласной філармоніі і біг-бэнда Нацыянальнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі.

**Марына ПЫРКОВА.**

**9 студзеня ў Гомелі адбылася сустрэча старшыні Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандра Якабсона са студэнтамі і выкладчыкамі дзвюх гомельскіх ВНУ — Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны і Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Аляксандр Якабсон выступіў з лекцыяй аб дэмаграфічным становішчы ў Гомельскай вобласці, адказаў на шматлікія пытанні студэнтаў і выкладчыкаў, а ў канцы сустрэчы ўручыў пасведчанні сямі студэнтам розных ВНУ Гомеля аб прысуджэнні ім стыпендый старшыні Гомельскага аблвыканкама за навукова-даследчую работу і ўдзел у міжвузаўскіх навукова-тэхнічных канферэнцыях.**

***НА ЗДЫМКУ: Таццяне БАХТАРОВАЙ уручана пасведчанне аб прысуджэнні стыпендыі старшыні Гомельскага аблвыканкама.***




Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛТА.



**Перспектывы развіцця Беларусі вызначаюцца не толькі эканамічнай сітуацыяй, вытворчым патэнцыялам, узроўнем тэхналогій і інфраструктуры, але перш за ўсё — станам і дынамікай народанасельніцтва, яго колькаснымі і якаснымі характарыстыкамі. Між тым, як адзначыў міністр працы і сацыяльнай абароны Уладзімір Патупчык, сучасная дэмаграфічная сітуацыя ў краіне характарызуецца працэсам натуральнага змяншэння насельніцтва. А гэта ўяўляе патэнцыяльную пагрозу ўстойліваму развіццю дзяржавы і нацыянальнай бяспецы.**

# ЯК СЦІСНУЦЬ ДЭМАГРАФІЧНЫЯ НАЖНІЦЫ

**— Уладзімір Мікалаевіч, даводзіцца канстатаваць, што Беларусь уступіла ў XXI стагоддзе не ў лепшай дэмаграфічнай форме...**

— Сітуацыя, што склалася ў рэспубліцы, на жаль, характарызуецца паглыбленнем дэмаграфічнага крызісу. І гэта, падкрэслю, нягледзячы на бясспрэчны рост узроўню і якасці жыцця насельніцтва ў нашай краіне.

Аднак трэба адзначыць, што дэмаграфічны крызіс у сувязі з дэпапуляцыяй насельніцтва і пастарэннем грамадства перажывае не толькі Беларусь. Гэта праблема характэрная для многіх эканамічна развітых краін свету.

Так, у нашай рэспубліцы ў 2005 годзе колькасць памерлых перасягнула колькасць народжаных на 51,5 тыс. чалавек. Асаблівасцю працэсу дэпапуляцыі насельніцтва ў Беларусі з'яўляецца адначасовае зніжэнне нараджальнасці і павелічэнне смяротнасці, у першую чаргу сярод мужчын у працаздольным узросце.

Пры існуючых узроўнях нараджальнасці і смяротнасці прагназуемая колькасць насельніцтва Беларусі ў 2010 годзе можа знізіцца да 9,5 млн чалавек, у 2020-м — да 8,8 млн. Нагадаю, на 1 снежня 2006 года яна складала, паводле даных Міністэрства статыстыкі і аналізу, 9 млн 716 тыс. чалавек.

Неспрыяльная дэмаграфічная сітуацыя ў Беларусі разглядаецца прэзідэнтам і ўрадам як пытанне першараднай дзяржаўнай важнасці. Дарэчы, наша краіна першая ў СНД прыняла ў 2002 годзе Закон «Аб дэмаграфічнай бяспецы Рэспублікі Беларусь». Ужо распрацаваны і вынесены на шырокае абмеркаванне праект Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі на 2007—2010 гады. Гэта сведчыць аб тым, што пільная ўвага кіраўніцтва рэспублікі накіравана на неадкладнае прыняцце мераў па выхаду краіны з дэмаграфічнага крызісу. Гэта рэальны крок, які дзяржава робіць для гарантавання будучыні краіны.

**— Якая асноўная мэта праграмы?**

— Яна заключаецца ў стварэнні ўмоў па прадухіленню далейшага пагаршэння дэмаграфічнай сітуацыі і фарміраванню перадумоў паляпшэння дэмаўзнаўляльных працэсаў. Агульныя затраты на рэалізацыю гэтай праграмы з усіх крыніц фінансавання ацэньваюцца ў аб'ёме Br672,5 млрд.

Праграмай прадугледжваецца рэалізацыя цэласнай сістэмы мераў сацыяльна-эканамічнага, прававога, арганізацыйнага характару, накіраваных на павышэнне якасці жыцця сем'яў з дзецьмі. Зніжэнне захваральнасці і смяротнасці за кошт мерапрыемстваў па фарміраванню здаровага ладу жыцця і ўстаранення ўплыву неспрыяльных фактараў асяроддзя пражывання дасць магчымасць замацаваць у грамадскай свядомасці імкненне да здаровага ладу жыцця і ў канчатковым выніку прывядзе да ўмацавання здароўя нацыі. Смяротнасць насельніцтва будзе зніжацца і ў выніку ўкаранення медыка-арганізацыйных, тэхналагічных і інавацыйных мерапрыемстваў.

У дакуменце таксама змяшчаюцца меры па аптымізацыі ўнутраных і знешніх міграцыйных патокаў з улікам нацыянальных дэмаграфічных інтарэсаў.

Штогадовае зніжэнне ўзроўню смяротнасці ў «звязцы» з павышэннем нараджальнасці дасць магчымасць сціснуць дэмаграфічныя нажніцы.

**— Як вядома, паказчык нараджальнасці «кульгае» практычна ва ўсіх еўрапейскіх краінах. У гэтых адносінах Беларусь — не выключэнне. Аднак апошнім часам у нашай рэспубліцы адзначаюцца станоўчыя тэндэнцыі ў гэтай сферы. Гэты прыемны факт усяляе аптымізм, бо павелічэнне нараджальнасці — адзін з важных рэцэптаў «лячэння» дэмаграфічнага крызісу.**

— Сапраўды, з 2003 года нараджальнасць у краіне ўзрастае (на 1000 жыхароў у 2002 годзе прыпадала 8,9 нараджэння, у 2005 годзе — 9,2). Дарэчы, у студзені—лістападзе 2006 года нарадзіліся 88 тыс. 123 чалавекі, што складае 106,5 працэнта да аналагічнага перыяду 2005 года.

Назіраецца павышэнне ўкладу другіх і трэціх па парадку нараджэнняў дзяцей у агульны ўзровень нараджальнасці. Акрамя таго, на працягу 2000—2005 гадоў колькасць шлюбаў узрасла на 17,3 працэнта. Колькасць разводаў, дасягнуўшы піку ў 1997 годзе (4,7 на 1 тыс. насельніцтва), скарацілася больш як на 28 працэнтаў і склала ў 2005 годзе 3,1 на 1 тыс. чалавек.

Аднак сучасныя параметры ўзнаўлення насельніцтва амаль у два разы меншыя, чым патрабуецца для замяшчэння пакаленняў. На адну жанчыну рэпрадуктыўнага ўзросту прыпадае 1,2 дзіцяці (сярод гараджан — 1,1, вяскоўцаў — 1,6). А для простага ўзнаўнення насельніцтва гэты паказчык павінен складаць 2,5 дзіцяці. Адмоўная з'ява таксама — замацаванне ў грамадскай свядомасці такой сацыяльнай нормы, як маладзетнасць. Доля сем'яў з адным дзіцем у агульнай колькасці сем'яў з непаўналетнімі дзецьмі складае 59 працэнтаў. Траіх і больш дзяцей маюць 89,4 тыс. сем'яў, або ўсяго толькі 6 працэнтаў.

З дэмаграфічнага пункту гледжання ў рэспубліцы на працягу апошніх гадоў складаецца сітуацыя, якая патэнцыяльна спрыяе павышэнню нараджальнасці. Так, у сярэднім каля 70 працэнтаў нараджэння дзяцей прыпадае на жанчын ва ўзросце 20—24 і 25—29 гадоў. Прагназуецца, што колькасць прадстаўніц гэтых узроставых груп будзе павялічвацца да 2010 года. У выпадку прыняцця кардынальных мераў, здольных паўплываць на рэалізацыю рэпрадуктыўных установак маладымі сем'ямі, можна чакаць пералому тэндэнцыі распаўсюджвання маладзетнасці. Менавіта таму асаблівую актуальнасць набываюць меры па стымуляванню нараджэння другога і трэцяга дзіцяці ў сем'ях, у якіх сёння з'яўляецца першынец, а таксама сем'ях, якія ў 90-я гады з-за матэрыяльных праблем «адклалі» нараджэнне дзяцей.

**— Такім чынам, для паляпшэння дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне неабходна стымуляваць жаданне сям'і мець дзяцей. І значыць, трэба будзе вызначыць — з улікам беларускай спецыфікі — метады эканамічнай і сацыяльнай падтрымкі.**

— Сапраўды, цяпер нельга ўпусціць час — відавочна вострая патрэбнасць у рэалізацыі правільнай сацыяльнай палітыкі, што садзейнічае дэмаграфічнаму развіццю краіны. Прычым гэта палітыка павінна будавацца на рэальным бачанні сітуацыі, дакладным яе аналізе.

Падпраграмай «Стымуляванне нараджальнасці і ўмацаванне сям'і» праекта Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі прадугледжана забеспячэнне сацыяльна-эканамічнай падтрымкі сям'і, мацярынства і дзяцінства. Будуць створаны ўмовы для нараджэння траіх і больш дзяцей. Важнымі складовымі дэмаграфічнага поспеху з'яўляюцца павышэнне прэстыжу сям'і, змяншэнне колькасці разводаў. І, безумоўна, фарміраванне адказнага бацькоўства, змяншэнне колькасці сацыяльных сірот.

На стымуляванне нараджальнасці нацэлена запланаванае ў праекце праграмы павелічэнне з 2 да 5 бюджэтаў пражытковага мінімуму (БПМ) памеру аднаразовай дапамогі ў сувязі з нараджэннем першага дзіцяці і з 2 да 7 БПМ — пры нараджэнні другога і наступных дзяцей. На гэтыя мэты прадугледжана накіраваць Br268 млрд з рэспубліканскага бюджэту і Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Мінпрацы і сацабароны. Дарэчы, у Беларусі дзяржаўную дапамогу ў выглядзе штомесячных дапамог атрымліваюць больш як 525 тыс. дзяцей — 27 працэнтаў ад агульнай колькасці дзіцячага насельніцтва. Нагадаю, за апошнія пяць гадоў памеры дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, узраслі больш як у 9 разоў.

**— Адным з найбольш значных індыкатараў узроўню жыцця насельніцтва з'яўляецца смяротнасць дзяцей ва ўзросце да 1 года.**

— Узровень і дынаміка дзіцячай смяротнасці адлюстроўваюць стан здароўя нацыі, развіццё аховы здароўя. У Беларусі гэты паказчык стабільна зніжаецца, асабліва ў гарадской мясцовасці. Узровень дзіцячай смяротнасці ў Беларусі — адзін з самых нізкіх сярод краін СНД. Гэты паказчык у 2005 годзе склаў 6,4 памерлага дзіцяці ва ўзросце да 1 года на 1000 народжаных (у 1995 годзе ён быў 13,3). Для параўнання: узровень дзіцячай смяротнасці ў 2004 годзе ў Казахстане склаў 14,5, у Малдове — 12,2, у Расіі — 11,6, ва Украіне — 9,5.

У рамках падпраграмы «Ахова здароўя маці і дзіцяці» будзе рэалізаваны комплекс мераў па паляпшэнню рэпрадуктыўнага здароўя насельніцтва, ахове здароўя маці і дзіцяці. Плануецца, што каэфіцыент дзіцячай смяротнасці ў Беларусі да 2011 года не перасягне 6,0.

**— Агульнапрызнана: сямейная палітыка павінна мець непасрэдна агульныя падыходы з жыллёвай палітыкай.**

— Забеспячэнне жыллём сем'яў з дзецьмі, асабліва маладых і шматдзетных, працягвае заставацца адной з найбольш актуальных праблем нягледзячы на тое, што ў 2004—2005 гадах прыняты шэраг указаў кіраўніка дзяржавы і пастаноў урада па паляпшэнню жыллёвай сітуацыі.

Гэтымі дакументамі прадугледжваецца права шматдзетных сем'яў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, на пазачарговае ўключэнне ў спісы для атрымання льготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў, а таксама фінансавую дапамогу ў іх пагашэнні. Шматдзетным сем'ям дадзена права на атрыманне льготнага крэдыту і сумеснае выкарыстанне льготнага крэдыту і аднаразовай бязвыплатнай субсідыі на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў. Памер ільготных крэдытаў шматдзетным сем'ям складае да 95 працэнтаў кошту будаўніцтва жылля, з разліку 20 кв.м на чалавека, тэрмінам на 40 гадоў пад 3 працэнты гадавых.

У Беларусі ўстаноўлены дыферэнцыраваны падыход да аказання шматдзетным сем'ям фінансавай дапамогі дзяржавы ў пагашэнні запазычанасці па льготных крэдытах. Так, пры нараджэнні трэцяга дзіцяці яна складае 30 працэнтаў ад сумы запазычанасці па выдадзеных крэдытах, пры нараджэнні чацвёртага дзіцяці — 50 працэнтаў. Пры нараджэнні пятага дзіцяці і наступных дзяцей запазычанасць па крэдытах пагашаецца дзяржавай у поўным аб'ёме. Такі ж прынцып прадастаўлення фінансавай дапамогі дзейнічае пры наяўнасці ў сям'і траіх і больш дзяцей.

На працягу бліжэйшых двух гадоў будзе прапрацавана пытанне прадастаўлення маладым сем'ям фінансавай падтрымкі для пагашэння запазычанасці па выдадзеных нherльготных крэдытах на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылля: у памеры 20 БПМ — у выпадку нараджэння першага дзіцяці або пры наяўнасці аднаго дзіцяці; у памеры 40 БПМ — у выпадку нараджэння другога дзіцяці або пры наяўнасці дваіх дзяцей; у памеры 50 БПМ — у выпадку нараджэння трэцяга дзіцяці або пры наяўнасці траіх наступных дзяцей.

Плануецца таксама павялічыць памер фінансавай падтрымкі ў пагашэнні запазычанасці па льготных крэдытах на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылля для шматдзетных сем'яў: з 30 працэнтаў да 50 працэнтаў — у выпадку нараджэння трэцяга дзіцяці або пры наяўнасці траіх дзяцей; з 50 працэнтаў да 70 працэнтаў — у выпадку нараджэння чацвёртага дзіцяці або пры наяўнасці чацвярых дзяцей.

**— На здароўе насельніцтва Беларусі негатыўна паўплывалі гады эканамічнага крызісу і неспрыяльная экалагічная абстаноўка. Гэта паўплывала і на фарміраванне грамадскіх каштоўнасцяў...**

— Таму захаванне здароўя насельніцтва, выхаванне здаровага ладу жыцця, далейшае павышэнне якасці жыцця ўсяго насельніцтва, усведамленне каштоўнасці сям'і з дзецьмі і забеспячэнне дастойнай старасці — галоўныя сацыяльна-дэмаграфічныя задачы XXI стагоддзя для Беларусі.

Апошнія тры гады назіраецца зніжэнне адносных паказчыкаў смяротнасці, пачала павялічвацца чаканая працягласць жыцця. Разам з тым вялікія адрозненні паміж працягласцю жыцця мужчын і жанчын, гарадскога і сельскага насельніцтва. Прычыны гэтага тояцца, як вы правільна заўважылі, не толькі ва ўзроўні аховы здароўя і экалогіі — праблема каранямі ідзе ў лад жыцця. Таму ўзяты курс у арыентацыі сацыяльных праграм на распаўсюджванне здаровага ладу жыцця — вельмі важнае і своечасовае рашэнне.

Неабходна прынцыпова змяніць самазахавальныя паводзіны і лад жыцця насельніцтва, асабліва мужчынскага. У гэтым таксама залог будучага паляпшэння дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне.

Падпраграма «Фарміраванне здаровага ладу жыцця і стварэнне спрыяльнага асяроддзя пражывання» накіравана на зніжэнне захваральнасці і смяротнасці. У ходзе рэалізацыі падпраграмы «Умацаванне здароўя і павелічэнне чаканай працягласці жыцця насельніцтва» плануецца ўдасканаліць аказанне першаснай медыка-санітарнай дапамогі насельніцтву; палепшыць прафілактыку асноўных сацыяльна значных хвароб і знізіць захваральнасць і смяротнасць ад іх; павысіць даступнасць высокатэхналагічнай медыцынскай дапамогі на ўсіх узроўнях яе аказання.

Падпраграма «Аптымізацыя міграцыйных працэсаў прадугледжвае стымуляванне наймальнікаў да стварэння рабочых месцаў у раёнах з высокім адтокам насельніцтва і крытычным станам рынку працы, паляпшэнне інфармаванасці насельніцтва аб магчымасці перасялення на новае месца жыхарства і новае месца работы ў сельскую мясцовасць. Будуць прыняты меры па забеспячэнню дадатнага сальда знешняй міграцыі.

Мерапрыемствы падпраграм «Навуковае забеспячэнне» і «Нарматыўна-прававое і інфармацыйнае забеспячэнне» накіраваны на стварэнне навукова абгрунтаваных перадумоў рэалізацыі мерапрыемстваў дзяржаўнай дэмаграфічнай палітыкі, а таксама прававое забеспячэнне дзяржаўнай палітыкі ў галіне дэмаграфічнай бяспекі, інфармацыйную падтрымку мерапрыемстваў гэтай нацыянальнай праграмы.

Словам, дэмаграфічная палітыка дзяржавы накіравана не толькі на павелічэнне колькасці насельніцтва, павышэнне якасці жыцця людзей, але і на рост чалавечага капіталу нацыі.

**Алена ПРУС, БЕЛТА.**

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

проводит открытый аукцион по продаже обращенного в доход государства вспомогательного производственного корпуса (об.пл. – 1178,3 кв.м) с пристройкой для пилорамы, расположенного по адресу: Минский район, д. Острошицкий городок, ул. Ленина, 1. Начальная цена – 361 740 000 белорусских рублей. Размер задатка составляет 5% от начальной цены и перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «Белпромстройбанк» МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объект продается без условий. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению местного исполкома на основании заявления победителя аукциона. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 13.02.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 12.02.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к.322.

Контактный телефон (8-017) 224-61-34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.





# ЭКСПАРТ АДУКАЦЫІ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Як зазначыла Тацяна Кавалёва, у беларускіх ВНУ сфарміраваліся два асноўныя падыходы да набору замежных грамадзян. Стратэгія большасці ВНУ зводзіцца да прыцягнення новых студэнтаў з кола сяброў, сваякоў і знаёмых сваіх студэнтаў-іншаземцаў. У тых ВНУ, дзе колькасць сярод студэнтаў прадстаўнікоў замежжа дастаткова вялікая (100—200 чалавек), такая тактыка, магчыма, і забяспечвае больш-менш стабільны прыток слухачоў на падрыхтоўчыя аддзяленні. Але ў тых навучальных установах, дзе «праслойка» замежнікаў зусім невялікая, гэта стратэгія не можа быць эфектыўнай.

ДРУГІ падыход заключаецца ў прыцягненні замежных грамадзян на вучобу ў Беларусь праз фірмы-пасрэднікі. Большасць гэтых фірмаў узначальваюць замежныя грамадзяне, якія навучаліся ў беларускіх ВНУ. Многія з іх атрымалі пасведчанне на права жыхарства ў Беларусі, але актыўна падтрымліваюць кантакты з радзімай. Гэтыя людзі на ўласным вопыце ведаюць як асаблівасці атрымання вышэйшай адукацыі ў нашай краіне, так і патрабаванні і правілы знаходжання на тэрыторыі Беларусі. З іх дапамогай ВНУ вырашаюць шэраг праблем, што ўзнікаюць у іншаземцаў, якія не ведаюць рускай мовы: прадстаўнікі пасрэднікаў сустракаюць іх у аэрапорце, вырашаюць праблемы з жыллём, афармленнем медыцынскай даведкі, рэгістрацыяй і афармленнем дагавора на навучанне. Пры гэтым у ВНУ няма неабходнасці ўтрымліваць спецыяльную службу суправаджэння і, адпаведна, несці дадатковыя выдаткі. Аднак і ў першым, і ў другім выпадку ВНУ не могуць прагназаваць будучы набор. Як правіла, па дагавору з ВНУ пасрэднік павінен прыцягнуць на навучанне ад 10 да 50 чалавек, але некаторыя пасрэднікі прыцягнулі ў 2006 годзе толькі ад 2 да 5 чалавек. І, як вынік, намечанага прыросту экспарту адукацыйных паслуг не адбылося... Калі параўноўваць з 1994—1995 гадамі, то замежных студэнтаў у беларускіх ВНУ стала ўтрая больш, але ў агульнай колькасці студэнцтва іх прадстаўніцтва не перавышае 1,5 працэнта. У краінах, якія робяць стаўку на экспарт адукацыйных паслуг, «доля» замежных студэнтаў вагаецца ад 3 да 8 працэнтаў. Для прыкладу, у Аўстраліі адукацыйныя паслугі займаюць у агульным аб'ёме экспарту тавараў і паслуг чацвёртае месца.

А вось яшчэ адна лічба, якая заслугоўвае ўвагі. Замежныя грамадзяне прыбываюць у Беларусь для навучання па запрашэнням, якія з'яўляюцца падставай для адкрыцця візы. У 2005 годзе ВНУ і сярэднімі спецыяльнымі навучальнымі ўстановамі былі аформлены 3,5 тысячы запрашэнняў, а да месца будучай вучобы даехаў толькі кожны другі замежнік, якому была адкрыта віза. Паводле слоў **дырэктара Дэпартамента па грамадзянству і міграцыі МУС Лідзіі ІВАНЧЫКАВАЙ,** некаторыя з прэтэндэнтаў на званне студэнта былі затрыманыя пры спробе нелегальнага перасячэння беларускай мяжы, частка з іх незаконна знаходзілася на тэрыторыі Беларусі і займалася прадпрымальніцкай дзейнасцю. Ёсць прыклады, калі ў пэўны рэгіён накіроўваюца па 30—50 запрашэнняў, а ў Беларусь адтуль прыязджаюць 1—2 чалавекі. Выходзіць, некаторыя ўстановы адукацыі працуюць на «авось», што абсалютна недапушчальна. Нават такая «дробязь», як афармленне рэкламнага буклета ці інфармацыі для замежных грамадзян на сваім сайце ў Інтэрнэце пераўтвараецца для пераважнай большасці ўстаноў адукацыі ў сапраўдную праблему.

— Замежных грамадзян мала цікавяць факты з гісторыі навучальнай установы. Ім патрабуецца канкрэтная карысная інфармацыя: якую спецыяльнасць можна там атрымаць, на якіх умовах, якія дысцыпліны давядзецца вывучаць, база для праходжання практыкі, ці можна прайсці паслядыпломную падрыхтоўку, колькі каштуе навучанне, як вырашаюцца праблемы з жыллём, наколькі наша краіна камфортная для пражывання замежных грамадзян, — падзяліўся сваімі думкамі з удзельнікамі калегіі **першы сакратар консульскага ўпраўлення Міністэрства замежных спраў Валерый ЦЫНКЕВІЧ.** — Да таго ж для рэкламы і прасоўвання сваіх адукацыйных паслуг трэба часцей удзельнічаць у разнастайных міжнародных выставах.

Тацяна Кавалёва лічыць, што ўжо даўно наспела неабходнасць падвесці навуковую глебу пад маркетынгавыя даследаванні міжнароднага рынку адукацыйных паслуг, і такія даследаванні павінны праводзіцца на рэспубліканскім узроўні... З 1 снежня 2006 года ў Міністэрстве адукацыі пачалося стварэнне электроннага банка даных на замежных грамадзян, якія навучаюцца зараз у Беларусі. А для аднаўлення кантактаў з замежнымі грамадзянамі — выпускнікамі беларускіх ВНУ папярэдніх гадоў — у красавіку гэтага года запланавана правядзенне ў Мінску міжнароднай канферэнцыі. Падобныя сустрэчы з выпускнікамі-замежнікамі павінны паспрыяць наладжванню пастаянных кантактаў з іншымі краінамі і сфарміраваць пазітыўнае стаўленне да Беларусі.

Ёсць у нашай краіне і шмат іншых праблем, якія стрымліваюць пакуль што рост экспарту адукацыйных паслуг. У першую чаргу гаворка ідзе аб забеспячэнні іх якасці. У ходзе праверкі, арганізаванай Міністэрствам адукацыі, былі выяўлены значныя разыходжанні ў навучанні на падрыхтоўчым курсе ў розных ВНУ. Адрозніваліся і вучэбныя планы, і тэрміны навучання, і аб'ём, і змест дысцыплін, якія там выкладаюцца. Нават дакумент аб заканчэнні падрыхтоўчых курсаў у нашай краіне не мае адзінай формы, што, натуральна, прыводзіць да цяжкасцяў пры паступленні замежных грамадзян у іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы. Магчыма, мэтазгодна было б сканцэнтраваць падрыхтоўку замежных грамадзян на падрыхтоўчым курсе адной ці некалькіх вышэйшых навучальных установ? На сённяшні дзень даўніверсітэцкай падрыхтоўкай замежных грамадзян займаюцца медыцынскія ВНУ, Беларускі дзяржаўны і Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэты.

Ні для каго не з'яўляецца сакрэтам, што ў вялікай ступені якасць падрыхтоўкі будучага спецыяліста залежыць ад таго, наколькі паспяхова ён засвоіць на падрыхтоўчым курсе рускую мову, на якой далей будзе весціся навучанне. Для прыкладу, павелічэнне патоку ў Беларусь жадаючых навучацца ў нашых ВНУ кітайскіх грамадзян нечакана акрэсліла наступную праблему: як высветлілася, для кітайцаў вельмі праблематычна вывучыць за год рускую мову. І як у гэтай сітуацыі паступаць: адлічваць за непаспяховасць або залічваць на першы курс яўна слабых студэнтаў? Разам з тым дзеючыя правілы дазваляюць падаўжаць тэрміны навучання на падрыхтоўчым курсе толькі ў выключных выпадках. На думку Тацяны Кавалёвай, выйсцем у гэтай сітуацыі магло б стаць стварэнне на базе замежных партнёраў беларускіх ВНУ падрыхтоўчых курсаў па вывучэнню рускай мовы для жадаючых атрымліваць адукацыю ў беларускіх вышэйшых навучальных установах. І такія прыклады ўжо ёсць: так, у 2007 годзе БНТУ чакае з Кітая першую групу з 16 чалавек. Сёння 22 ВНУ маюць 60 дагавораў з кітайскімі ўстановамі адукацыі, і тэарэтычна ў рамках кожнага з іх можна было б наладзіць эфектыўную тэхналогію падрыхтоўкі будучых студэнтаў. Больш таго, такая папярэдняя падрыхтоўка ў замежнай краіне дазволіла б адабраць менавіта тых маладых людзей, якія ставяць сабе за мэту атрымаць якасную адукацыю, а не проста перабрацца ў заможную Еўропу.

РЭКАМЕНДАЦЫІ міністэрства наконт камплектацыі груп для навучання замежных студэнтаў рускай мове, згодна з якімі група камплектуецца з 10—12 чалавек, таксама патрабуюць перагляду. Набыты вопыт сведчыць, што для паспяховага навучання групы павінны быць значна меншыя. Запланаваны рост колькасці студэнтаў-іншаземцаў вымагае і павелічэння колькасці выкладчыкаў рускай мовы як замежнай, якія ў шэрагу ВНУ ўвогуле адсутнічаюць. Да таго ж большасць выкладчыкаў рускай мовы як замежнай не валодаюць спецыяльнай лексікай, якая выкарыстоўваецца ў межах спецдысцыплін на старшых курсах. Паводле меркавання спецыялістаў, неабходна забяспечыць узаемадзеянне паміж кафедрамі рускай мовы і спецыяльнымі кафедрамі і падрыхтаваць адпаведныя гласарыі па профдысцыплінах.



**Міністр адукацыі Аляксандр РАДЗЬКОЎ** пацікавіўся ў прадстаўнікоў ВНУ, ці можа стаць выйсцем арганізацыя вучэбнага працэсу для студэнтаў-іншаземцаў на першых курсах (пакуль яны не засвояцца ў рускамоўным асяроддзі) на англійскай мове? Як высветлілася, Гомельскі медуніверсітэт ужо практыкуе выкладанне вучэбных дысцыплін на англійскай мове. Аднак нават там прызнаюць, што толькі ў працэсе пастаянных зносінаў з аднакурснікамі-беларусамі замежныя студэнты пачынаюць размаўляць на рускай мове. Такім чынам, больш перспектыўнымі з'яўляюцца ўсё ж такі змешаныя групы. Акрамя таго пераважная большасць замежных грамадзян, якія прыязджаюць на вучобу ў Беларусь, не ведаюць і англійскую мову...

Цікаўна, што самі студэнты выказвалі працоўнай групе Міністэрства адукацыі пажаданні аб павелічэнні колькасці гадзін на вывучэнне рускай мовы, а таксама аб увядзенні спецыяльных курсаў, якія б улічвалі асаблівасці іх будучай прафесійнай дзейнасці на радзіме. На прадастаўленні большай свабоды ў фарміраванні вучэбнага плана для іншаземцаў настойваюць і медыцынскія ВНУ. Навошта, напрыклад, замежным студэнтам вывучаць асаблівасці структуры беларускай сістэмы аховы здароўя і службовыя абавязкі намесніка галоўнага ўрача па паліклінічнай рабоце? Затое курс па вывучэнню трапічных хвароб быў бы для іх вельмі дарэчы. Ці, скажам, як на першых курсах вывучаць філасофію з яе найскладанейшымі паняццямі, калі яшчэ «правісае» руская мова? Карэкціроўка вучэбных планаў магла б адбывацца за кошт сацыяльна-гуманітарных дысцыплін і гадзін, адведзеных на фізічнае выхаванне, тым больш што заняткі па фізвыхаванню замежныя студэнты, як правіла, ігнаруюць.

Просяць студэнты-іншаземцы таксама вярнуць назад пяцібальную шкалу, паколькі ёсць праблемы з перавадам адзнак, выстаўленых па 10-бальнай шкале, у бальныя сістэмы, што дзейнічаюць у іх на радзіме. Для многіх абавязковай умовай працаўладкавання на радзіме з'яўляецца дыплом бакалаўра...

«У экспартнай палітыцы адукацыйных паслуг прыярытэты павінны паступова змяшчацца ў бок постдыпломнай адукацыі», — лічыць Тацяна Кавалёва. Па-першае, многія выпускнікі беларускіх ВНУ з кола замежных грамадзян затым павышаюць сваю кваліфікацыю ў іншых краінах, што зусім не спрые прасоўванню беларускіх тавараў і нашых тэхналогій на заходнія рынкі і ўскосна зніжае каштоўнасць беларускай адукацыі. Па-другое, страчваецца сувязь з людзьмі, якія навучаліся ў Беларусі па 6—8 гадоў. У Злучаных Штатах Амерыкі амаль палова іншаземцаў навучаюцца менавіта на постдыпломным узроўні. А ў нас на сёння аспіранты і ардынатары складаюць толькі 4 працэнты ад агульнай колькасці замежных грамадзян, якія атрымліваюць адукацыю ў вышэйшых навучальных установах.

Асобным блокам стаяць праблемы, звязаныя са стварэннем умоў для пражывання іншаземцаў. Найбольшая колькасць негатыўных уражанняў у замежных студэнтаў звязана з пражываннем у інтэрнатах: адсутнасцю гарачай вады, месцамі агульнага карыстання, агульнымі кухнямі, шчыльнай засеаленасцю інтэрнацкіх пакояў і гэтак далей. Між іншым у многіх замежных студэнтаў, пазбаўленых магчымасці часта ездзіць да бацькоў, родным домам на два—тры гады становяцца менавіта студэнцкія інтэрнаты.

У міністэрстве падлічылі, што для прыцягнення ў Беларусь прагназнай колькасці замежных студэнтаў неабходна кожны год ствараць або вызваляць ад 1200 да 2500 тысяч месцаў у студэнцкіх інтэрнатах. Магчыма, будаўніцтва студэнцкай вёскі ў сталіцы зможа вырашыць гэту вострую праблему, але гэта будзе не так хутка, як бы нам хацелася, таму адзіным выйсцем застаюцца прыватныя кватэры. Напрыклад, грамадзяне Турцыі, якія актыўна праяўляюць цікавасць да беларускай адукацыі, адразу заяўляюць аб сваім нежаданні жыць у інтэрнатах. Здавалася б, знімай кватэру і вучыся, але згодна з беларускім заканадаўствам пры пераездзе на прыватную кватэру замежны студэнт павінен зарэгістравацца на новым месцы жыхарства, чаго не дазваляюць зрабіць гаспадары кватэры, якім у гэтым выпадку давядзецца заключаць дагавор найму і плаціць дзяржаве падатак. У Дэпартаменце па грамадзянству і міграцыі МУС РБ канстатуюць, што апошнім часам пачасціўся бескантрольны выезд замежных студэнтаў з інтэрнатаў на прыватныя кватэры. У шэрагу выпадкаў самі іншаземцы дрэнна праінфармаваныя аб адказнасці за свабоднае перамяшчэнне, што з'яўляецца ўжо прабелам у выхаваўчай рабоце вышэйшых навучальных устаноў.

У 2006 годзе пачала дзейнічаць новая інструкцыя МУС аб парадку выдачы віз, у тым ліку і вучэбных. Новы парадак, у прыватнасці, прадугледжвае ўзгадненне запрашэння з тэрытарыяльнымі органамі па грамадзянству і міграцыі, што значна павялічыла тэрміны афармлення запрашэння (у асобных выпадках нават да двух месяцаў). На працягу 30 дзён замежны грамадзянін двойчы праходзіць у Беларусі рэгістрацыю і павінен мець на руках два пакеты дакументаў. Пры гэтым у Расіі і ва Украіне дзейнічае больш спрыяльны рэжым для студэнтаў-іншаземцаў і беларускім ВНУ даводзіцца «канкураваць» з суседзямі ўжо на ўзроўні гэтага пытання.

Цяжка растлумачыць іншаземцам таксама, чаму яны не могуць здзейсніць экскурсійную паездку ў Расію, з якой у нас дзейнічае бязвізавы рэжым. Але, як патлумачыў прадстаўнік Міністэрства замежных спраў, у бліжэйшы час не плануецца падпісанне паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй пагаднення аб узаемным прызнанні выданых віз, таму абяцаць штосьці будучым студэнтам не варта.

ЯШЧЭ адну праблему закранула на калегіі Тацяна Кавалёва — неабходнасць распрацоўкі больш гібкай схемы набору для прадстаўнікоў іншых краін. Грамадзяне Расійскай Федэрацыі, Казахстана, Кыргызстана і Таджыкістана, якія ў рамках заключаных паміж нашымі краінамі пагадненняў карыстаюцца тымі ж правамі, што і беларусы, былі пазбаўленыя летась магчымасці ўдзельнічаць у нашай прыёмнай кампаніі: цэнтралізаванае тэсціраванне праводзілася ў Беларусі ў той час, як школьнікі гэтых краін здавалі выпускныя іспыты. **Дэкан факультэта міжнароднага супрацоўніцтва БНТУ Юліян ЯРМАК** прапанаваў увогуле не абмяжоўваць тэрміны набору на падрыхтоўчае аддзяленне ці падрыхтоўчыя курсы: дастаткова, на яго думку, устанавіць толькі працягласць навучання і аб'ём вучэбнага плана.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# НЕ ТОЛЬКІ ТАННАСЦЬ АДУКАЦЫІ
## прываблівае замежных студэнтаў у Беларусь

**У Беларусі вучыцца каля 6000 замежных студэнтаў, уключаючы студэнтаў з краін СНД. Больш за ўсё прыехала студэнтаў з Паднябеснай — каля 1000. Нямала таксама і з Індыі, Лівана, Сірыі і іншых краін.**

**Карэспандэнт «Звязды» высветліла ў маладых людзей, чаму яны абралі менавіта беларускія ўніверсітэты, ці задавальняе іх узровень беларускай адукацыі і дзе збіраюцца працаваць, калі атрымаюць дыпломы.**

***Вадзім Ма Цзюнь, факультэт даўніверсітэцкай адукацыі БДУ:***

— У Беларусі вучыцца больш танна, чым у Амерыцы і Еўропе. Да таго ж, у мяне тут шмат сяброў і яны лічаць, што адукацыя ў Беларускім дзяржаўным універсітэце вельмі якасная. Я тут яшчэ не зусім асвойтаўся, таму не ведаю куды паеду працаваць, але хутчэй за ўсё дадому, у сваю краіну — Кітай.

***Сэм Максан Варыдзігітэрэ, будучы хірург, вучыцца на 2-м курсе ў БДМУ:***

— Мне заўсёды падабалася Беларусь — яна такая спакойная. Вучыцца тут не так дорага, як у іншых краінах, але цяжка — падручнікі не на роднай мове чытаць складаней. А калі скончу ўніверсітэт, то паеду працаваць у Нігерыю — дапамагаць суайчыннікам.

***Вань Чын, будучы эканаміст, вучыцца на 5-м курсе БДУ:***

— Справа нават не ў тым, што ў іншых краінах дарагая вучоба, а ў тым, што там дарагое жыццё. Мой сябар вучыцца ў Францыі, ён лічыць, што там вучыцца лягчэй чым у СНД, але там вельмі дарагія прадукты. Яму даводзіцца шмат працаваць і менш часу ўдзяляць вучобе.

— А тут, на мой погляд, для вучобы створаны ўсе ўмовы. У інтэрнаце прадастаўляюць пакой, можна падзарабіць і бязбедна жыць. Вучыцца ў БДУ цікава, але цяжка — патрабуюць шмат. Я вельмі сумую без родных мясцін, і таму працаваць паеду ў Кітай, дадому.

***Негін Мірзазадэх, стаматалагічны факультэт БДМУ:***

— У Іране, адкуль я родам, універсітэтаў мала , а студэнтаў шмат. Менавіта таму і даводзіцца нашым студэнтам ехаць вучыцца ў іншыя краіны. У Мінск я прыехала вучыцца таму, што тут не так шумна і шматлюдна, як ў Маскве і ў Кіеве. І я не памылілася, бо тут яшчэ і людзі адкрытыя і добрыя. У гэтым упэўнілася і мая сястра, якая таксама прыехала вучыцца ў Беларусь, нягледзячы на тое, што вучыцца тут вельмі складана. Працаваць я хацела б у сваёй роднай краіне і спадзяюся, што так і будзе.

***Нін Дзічэнь, вучыцца на эканаміста ў БДУ:***

— У Беларусь мяне прывёў сам лёс. Я спачатку паехаў вучыцца ў Маскву, бо ў мяне там жывуць сваякі. Пражыў прыкладна паўгода, як у Маскве адбыўся тэракт. Мае бацькі вельмі спалохаліся за маё жыццё, і хацелі, каб я вярнуўся дадому. Але сваякі прапанавалі вучыцца ці ў Беларусі, ці ва Украіне. Я выбраў Беларусь, таму што ў гэтай краіны з Расіяй Саюз — лягчэй ездзіць да сваякоў у Маскву. Бацькі згадзіліся, бо самі лічаць Беларусь бяспечнай краінай. Жыць і вучыцца мне тут падабаецца. Але працаваць я паеду ў Маскву, бо там мне ўжо прапанавалі добрую працу.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

## Канстанцін КАЛЬЦОЎ:

# «НА ВЯРШЫНІ ГАРЫ Я НЕ БЫЎ. ПАКУЛЬ»

### Беларускі хакеіст так тлумачыць сваё вяртанне з Амерыкі на постсавецкую хакейную прастору: «Каму патрэбен у Амерыцы нападаючы з трыма галамі?». Прызнаецца, што ў Расіі трапіў у сапраўдны «дурдом»



**Хакейны пачатак Кальцова здаваўся вельмі радасным. Ад'езд беларуса за акіян, гульні з вялікім Лем'е, Марозавым, Кавалёвым... Здавалася, аб такім можна толькі марыць маладому таленту. Але тут умяшаўся лакаут, і ўсё перавярнулася дагары нагамі. Хтосьці падпісаў паспяховыя кантракты, Кальцоў жа аддаў перавагу вяртанню ў родны Мінск, у мясцовае «Дынама». Нечаканая прапанова са «Спартака» і гульня ў суперлізе... Ну, а затым лакаут закончыўся, і Кальцоў зноў вярнуўся ў Амерыку. Праўда, ненадоўга. Бясконцыя траўмы, аперацыі, недавер трэнераў — і, як вынік, разрыў кантракта. Пад заслону — запрашэнні клубаў расійскай суперлігі, з якіх дабром нападаючы адказаў толькі ўфімскаму «Салават Юлаеву».**

**Погляд Кальцова прасякнуты крыўдай. Поўная абыякавасць і ўсведамленне таго: што я тут, уласна, забыўся? Але не страціў пачуцця гумару і надзеі вярнуцца зноў у НХЛ. Ну, а сёння ён дае інтэрв'ю нашай газеце.**

#### Каму патрэбен нападаючы з трыма галамі ў сезоне?

***— Канстанцін, адчуваеце, што ўкаціліся ў гульню, знайшлі сваю каманду?***

— Пакуль не адчуваю.

***— Ёсць жаданне вярнуцца ў Амерыку?***

— Ёсць жаданне ўвогуле закончыць з хакеем. Жартую, канешне.

***— Што не заладзілася ў «Пітсбургу»?***

— Адкуль я ведаю, што не заладзілася? Дрэнна гуляю, значыць. Мёртвы я!!! *(смяецца)*. Каму, скажыце, патрэбен нападаючы з трыма галамі ў сезоне? І якая розніца: давалі мне гуляць або не?!

***— Што вам перашкаджае? Ёсць жа ўсе даныя! І пачатак быў якім!***

— Ну, які пачатак? Я стаў аналізаваць сваю сітуацыю. Выходзіць, з 17 гадоў не гуляў увогуле. У Чарапаўцы сядзеў у чацвёртым звяне, выходзячы па шэсць змен за гульню. У такім узросце малады хакеіст павінен гуляць: няхай лепш ужо ў другой камандзе. Паехаў у Новакузнецк, не па сваёй волі, у 19 гадоў. І там не атрымліваў гульнявога часу.

***— З чым звязаны недавер трэнераў? Тое, што вы прыехалі з «правінцыі»?***

— Проста да таго часу я яшчэ не быў гатовы гуляць у камандзе майстроў. Сыры. Згуляў дзве-тры гульні ўсяго. У такім узросце гэта згубна для ігрока. Лепш адправіць яго ў ніжэйшую лігу або ў другую каманду.

***— Чаму многія ігракі, гуляючы за фарм-клуб, так з яго і не выкараскваюцца?***

— Складана сказаць. Трэнер, удача — шмат фактараў.

***— Апраўданні апраўданнямі, але чаму вы не выкарысталі свой шанц, трапіўшы ў «Пітсбург»?***

— Чаму? Першы год быў нядрэнны, скажам так. Нават не па ачках, а па самой гульні. Усе былі задаволены, я сам быў задаволены. Сітуацыя змянілася. Купілі многа зорак. У першыя тры звяны не трапляеш. Усё!

***— Даваряюць жа Малкіну, Кросбі?***

— Яны ж забіваюць. У 35 гульнях Малкін ужо забіў 17 галоў. Для першага сезона даволі шмат. Кросбі — гэта проста чалавек ад Бога.

***— Ногі і рукі не адтуль растуць?***

— Галава не думае, а думае іншае месца *(смяецца)*. Любы ігрок можа трапіць у НХЛ. І я магу туды паехаць пры ўдачным збегу акалічнасцяў. Большасць ігракоў расійскай суперлігі маглі б гуляць там, але не гуляюць.

***— Траўма паўплывала на тое, што вы сталі менш выніковым?***

— А як вы думаеце? Два леты запар прапускаць перадсезонную падрыхтоўку з-за аперацыі, канешне, вялікі мінус.

***— На якой ноце рассталіся з амерыканскай камандай?***

— У канцы сезона трэнер гаворыць: рыхтуйся, я на цябе, Косця, разлічваю! Як там расстаюцца? Я проста даведаўся, што са мной не працягваюць кантракт. Была прапанова «Каламбуса», але ў Расіі плацяць больш.

***— У вас ёсць жаданне вярнуцца ў «Пітсбург»?***

— Ніколі!!! Надзеі вярнуцца ў НХЛ не страчваю, але ў Пітсбург я ніколі больш не паеду. Любая іншая каманда.

***— Чаму?***

— Навошта ехаць туды, адкуль цябе «убралі»? Ёсць яшчэ варыянт «Дынама» Мінск *(смяецца)*. Калі б, канешне, паступіла прапанова ад Хэнлана, я нават не раздумваў бы. Нават на ўмовах, якія прапаноўваў «Каламбус».

***— Засталася такая непрыязнасць да Пітсбурга?***

— Толькі да гэтай каманды.

***— У чым праяўлялася гэта анархія?***

— Прыклад? Хлопцы самі аплачваюць білеты і не могуць атрымаць за іх грошы па тры месяцы. У НХЛ жа ўвахоздзіць адны профі! Настольki была паразгільдзяйску пастаўлена ўся арганізацыя. Клюшкі і форму своечасова атрымліваў толькі Лем'е, у мінулым сезоне Кросбі. Астатнія чакалі.

***— Такіх зорак, як Кросбі і Малкін, вельмі цэняць?***

— Канешне, цэняць. На іх жа ходзіць народ, яны прыносяць прыбытак камандзе.

***— Як вас прынялі амерыканцы?***

— Нармальна. Калектыў быў дружным. Кантактаваў з усімі.

***— Пра Пітсбург якія ўспаміны?***

— Звычайны амерыканскі горад.

***— Ёсць падзел у Амерыцы на вашых і нашых?***

— Не. У Пітсбургу проста аддаюць перавагу канадцам.

***— Расіянін Ганчар вас не як падбадзёрваў?***

— Ён гаварыў: Давай, Касцян, рві за братоў-славян!

***— Рві, братан, а я хутка на падмогу! Як можна забраць на вяршыню гары і ўпасці з яе?***

— На вяршыні гары я не быў. Пагуляць пару сезонаў у НХЛ — гэта хіба вяршыня?

***— Беларусаў, хто туды трапляў, можна пералічыць па пальцах. Мы так ганарыліся, што вы там гулялі***

— Птушаня вярнулася...

***— ...З абпаленымі крыламі?***

— Чаму абпаленымі? Стаў больш вопытны і разумны. Так сітуацыя склалася. Ну, чаго? Калі б не лакаут, то, канешне, усё было б зусім па-іншаму.

***— Для хакеіста важна ўдача?***

— Хутчэй, упартасць і праца.

***— Пра што думалі, стоячы каля трапа самалёта з чамаданамі?***

— Спакойна адлятаў. Якія чамаданы? Рэчы там засталіся. Я ляцеў у адпачынак, на лета. Купіў дом там. Сярэдні. Два паверхі.

***— Што там ёсць?***

— Усё, што патрэбна ў доме.

***— Камфортнасць павінна быць якой, каб вам было ўтульна?***

— Як звычайна. Шмат гарэлкі, віскі. Добрая стэрэасістэма, каб кожны вечар наладжваць вечарынкі. Сябры, усё па поўнай *(смяецца)*.

***— Былі камандныя вечарынкі?***

— Пасля кожнай гульні была камандная вечарынка. У самалёце, вяртаючыся пасля кожнай гульні.

***— Зараз ваш дом на замку?***

— Так, на продаж.

***— Можа, я куплю?***

— Колькі даяце?

***— Пяцьсот тысяч долараў задаволіць?***

— Ну, калі даяце, ключы вашы!

***— Чым займаліся ў Амерыцы ў вольны час?***

— Начныя клубы, бары, дыскатэкі, дзяўчаты.

***— Як з дзяўчынай пазнаёміліся?***

— Як звычайна. Пайшлі ў бар, напіліся, раніцай прачнуліся: бачыцам адно аднаму спадабаліся. Давай прыязджай у госці. Добра! Не бывае такога?

***— З дзяўчынай у першую ноч прачнуцца ў адным ложку?***

— Так. Ва ўсіх па-рознаму. Галава баліць. Нічога не памятае нічога і дзяўчына побач прыгожая. Гэта было ў Атланце. Больш ні слова пра асабістае жыццё.

***— Косця Кальцоў змяніўся?***

— Так, змяніўся. Менш піць стаў *(смяецца)*. Гарэлкі мы не пілі. Пілі віскі з колай.

***— Рэжым?***

— У канцы сезона чаго рэжыміць? Расслабляцца ніколі не шкодна. Мы ж не п'ём да страты пульсу. Чаму не выпіць бакал піва або віна? У самалёце пасля гульняў піва даюць, афіцыйна дазволена ў НХЛ. Згуляў, калі ласка. Ніхто не забараняе. Галоўнае, сачы за здароўем. Ёсць ігрок у «Пітсбургу», не буду называць яго прозвішча. Трэнер яму спецыяльна гаварыў: ідзі, напіся перад гульнёй. Калі ён не піў, не мог забіць. Піў піва.

***— Якім напіткам аддаюць перавагу амерыканцы?***

— Усяму, што гарыць. Усе п'юць і мы п'ём. Французская смачная гарэлка. Якая там гарэлка! Як вада. Раніцай, як агурочак. У нас не прадаюць такой. Шкада. Так бы зараз накаціў.

***— Канчатковае рашэнне Кальцова — у Пітсбург не вернецца?***

— Не, ніколі больш! Японскі рэстаран там адзін ёсць. Заказчаў! Сюды б гэтага повара зараз, м-м. Няма ў нас такіх рэстаранаў. Што зробіш? Куплю білет і палячу туды. Таго варта. Сушы смачныя.

#### Жыў у пентхаўзе, а пераехаў у аднапакаёвую ў панельным доме. Як было дваццаць гадоў назад, так усё і засталося

***— Якім здаецца расійскі хакей пасля НХЛ?***

— Сумным. Узровень, падрыхтоўка — усё. Вар'яцкі дом!

***— Чаму Уфа?***

— Было некалькі варыянтаў. Казань была. Не дамовіліся.

***— Як Уфа?***

— Нармальна. Мне падабаецца.

***— Уфімская распранальня адрозніваецца ад амерыканскай?***

— Груба кажучы, жывеш у пентхаўзе і пераязджаеш у аднапакаёвую кватэру ў панельным доме. Там у НХЛ у распранальні ёсць усё, што трэба. Ва Уфе няма добрага трэнажорнага зала, канап з вялікім тэлевізарам. Не перадаць словамі.

***— Не бывае дэпрэсіўных момантаў?***

— Ды ў мяне ўвогуле адзін пазітыў ідзе. Як гэта слова сказалі? Дэпрэсія, во! Што гэта такое?

***— Расіі далёка да НХЛ?***

— Думаю, не так далёка. Мне здаецца, яшчэ крыху, прыйдзе новае пакаленне трэнераў. І суперліга іх дагоніць.

***— Уся справа ў старых «маразматыках», якія перашкаджаюць прагрэсу?***

— Так не назавём, але штосьці накшталт гэтага.

#### Лепш за Хэнлана не сустракаў. Да яго ў зборную ехаў не па грошы

***— Што сказалі б пра Хэнлана, як пра трэнера?***

— На сённяшні дзень я не сустракаў лепшага трэнера.

***— Чаму?***

— Прычына? Зносіны з ігракамі, настрой на гульню. Раней у зборную прыязджалі зарабляць грошы, а да Хэнлона прыязджаюць гуляць за краіну.

***— Да Захарава, выходзіць, прыязджалі гуляць за грошы?***

— Не ведаю. Я быў малады. Гэта была адна з прычын — зарабіць грошы.

***— Ці ёсць падставы гаварыць так?***

— Чаго? Прэміяльныя добрыя давалі. Пасля прыходу Хэнлана ўсё змянілася. Ігракі цяпер едуць гуляць менавіта за краіну, за зборную. За сябе, за свой гонар. Зараз беларусы на пад'ёме, запрашаюць энхаэлаўскіх трэнераў.

***— Чакаеце прапановы ад Курта Фрэйзера?***

— З такой гульнёй, якую я паказваю на сённяшні дзень, не.

***— Чулі што-небудзь пра яго?***

— Не.

***— Зборная Беларусі складаецца цалкам з ігракоў старога пакалення?***

— Якога старога? Мялешка, Чупрыс, Касцючонак, Грабоўскі, Касціцын, Касціцын-малодшы, Кукушкін, Дзянісаў. Сябе не назваў, дзевяць. Яшчэ не стары. Паўкаманды маладых. Вось дык слова прыдумалі — старыя. Яны не старыя, яны — вопытныя, патрэбныя камандзе.

***— Якія са зборных на сённяшні момант самыя моцныя?***

— Не ведаю. Не гуляю на апошнім чэмпіянаце свету. У Аўстрыі чэхі былі. Яны з усімі камандамі гулялі вельмі добра.

***— Што Косця Кальцоў чакае ад гэтага года?***

— Свінню чакаю *(смяецца)*. Каб жыццё свінню не падклала, але сальца я ўсё ж люблю.

**Вольга РАМАНЮК.**

---

## Спорт-тайм

### ПРОЙГРЫШ НА ВЫНІК НЕ ПАЎПЛЫВАЎ

Беларуская жаночая зборная па настольнаму тэнісу да тэрмінова забяспечыла сабе выхад у фінальную стадыю чэмпіянату Еўропы, таму сустрэча з расіянкамі ў апошнім туры кваліфікацыйнага раўнда была толькі праверкай сваіх сіл: наша каманда ўступіла ў гасцях — 2:3.

### ЦІШЭЙ ЕДЗЕШ — ДАЛЕЙ БУДЗЕШ

На старт пятага этапу ралі «Лісабон-Дакар» не выйшлі чатыры расійскія ўдзельнікі (2 пазадарожнікі, 1 грузавік і 1 матацыкл). Збочыў з трасы і пацірбаваны чэмпіён «Дакара» Уладзімір Чагін, які выступае ў класе грузавікоў (яго КамАЗ перакуліўся). Улічваючы цяжкасць аўтамабільнага марафону і трагедыі, якія адбываюцца на этапах ( сёлета ўжо ёсць ахвяра), афіцыйнае выданне Ватыкана назвала «Дакар» крывавай гонкай. На шчасце, з беларускімі ўдзельнікамі ўсё ў парадку: Сяргей Шкель і Аляксандр Інус з кожным днём набліжаюцца да сотні, бо ўжо не рызыкуюць. Іх «Оскар» пад беларускім сцягам ужо дабраўся да сэрца Сахары.

### ЛІДАРЫ І АЎТСАЙДАРЫ

Яшчэ да завяршэння рэгулярнага чэмпіянату стала зразумела, што барацьбу за ўзнагароды Адкрытага першынства Беларусі па хакею з шайбай не змогуць працягнуць «Брэст» і кіеўскі «Сокал»: пасля 40 матчаў гэтыя клубы знаходзяцца ў ніжэ турнірнай табліцы і з невялікай колькасцю ачкоў (адпаведна 8 і 24) не маюць шанцаў трапіць у васьмёрку мацнейшых, якая будзе спаборнічаць у чвэрцьфінале. У тройцы лідараў сталічныя каманды — «Дынама» (87 ачкоў), «Юнацтва» (86) і «Керамін» (85). Вынікі матчаў экстралігі мінулага тура: «Брэст» — «Дынама» (Мінск) — 1:2, «Нёман» (Гродна) — «Юнацтва» (Мінск) — 1:4, «Керамін» (Мінск) — «Сокал» (Кіеў) — 6:2, «Хімвалакно» (Магілёў) — «Гомель» — 4:5 (у авертайме), «Металург» (Жлобін) — «Хімік-СКА» (Наваполацк) — 4:1.

### БЫВАЙ, БЕКХЭМ?

Пасля завяршэння сезона экс-капітан зборнай Англіі Дэвід Бекхэм развітаецца з іспанскім «Рэалам», бо ў асноўным сядзіць там на лаўцы запасных. Нагадаем, што англічанін перайшоў з «Манчэстэр Юнайтэд» у «Рэал» летам 2003 года.

### АДНЫ ПЕРАМОГІ

У сталічным футбольным манежы праводзіцца III Міжнародны юнацкі турнір, у якім удзельнічаюць каманды з васьмі краін.

Зборная Беларусі, якая выступае ў групе «А», на старце турніру атрымала дзве перамогі. Спачатку 17-гадовыя падапечныя Андрэя Зыгмантовіча разграмілі літоўскіх равеснікаў 5:0, а затым узялі верх над азербайджанцамі з мінімальным лікам 1:0. У гэтай групе гуляе таксама славацкая каманда, якая перагуляла зборную Азербайджана, а потым уступіла літоўцам — 0:4. 12 студзеня, наша каманда гуляе са славакамі, а азербайджанскія футбалісты памераюцца сіламі з літоўцамі.

А ў Санкт-Пецярбургу адбываецца традыцыйны турнір 19-гадовых футбалістаў памяці Валянціна Гранаткіна. На папярэднім этапе зборная Беларусі заняла першае месца ў групе «В».

---

## Перапісваем гісторыю

# ЗАМЕСТ СТАТУІ ЗЕЎСА — СТАТУІ ХРЫСТА, СВАБОДЫ, ВОСТРАВА ПАСХІ



**Крэмль і Эйфелева вежа могуць выцесніць адзіны з сямі класічных цудаў свету, які застаўся да нашых дзён, — піраміду Хеопса ў Гізе.**

Спецыяльная камісія звыш чым з 200 славутасцяў планетарнага маштабу выбрала 21 гістарычны помнік і прапануе кожнаму жыхару Зямлі аддаць свой голас за новыя сем цудаў на сайце швейцарскага некамерцыйнага фонду www.new7wonders.com. Канчатковыя вынікі стануць вядомымі, зразумела, 7.07.2007 года у Лісабоне. Сярод намінантаў, на жаль, няма беларускіх цудаў. З бліжэйшага замежжа ёсць толькі прадстаўнікі Расіі — маскоўскі Крэмль і Пакроўскі сабор. Акрамя іх, у шорт-ліст трапілі: Акропаль (Афіны, Грэцыя), Альгамбра (Гранада, Іспанія), Ангкорскі храм (Камбоджа), Ацтэкскі горад Чычэн-Ітца (Юкатан, Мексіка), Вялікая сцяна (Кітай), горад Цімбукту (Малі), Старадаўні горад Пятра (Іарданія), замак Нойшвайштайн (Германія), будынак Сіднэйскага опернага тэатра (Аўстралія), Калізей (Рым), Мачу Пікчу (Перу), піраміда Хеопса ў Гізе (Егіпет), статуі вострава Пасхі (Чылі), статуя Свабоды (Нью-Йорк), статуя Хрыста (Рыа-дэ-Жанейра, Бразілія), Стоўнхендж (Эймсберы, Вялікабрытанія), Тадж Махал (Агра, Індыя), Харм Кіаміцу (Кіота, Японія), храм Святой Сафіі (Стамбул, Турцыя), Эйфелева вежа (Парыж, Францыя).

Якімі крытэрыямі карыстацца ў выбары новых сямі цудаў? Папулярнасць, прыгажосць... Усё даволі суб'ектыўна. Каб справіцца з цяжкім выбарам, нагадаю класічныя сем цудаў: піраміда Хеопса ў Гізе, вісячыя сады Семіраміды, храм Арцэміды ў Эфесе, статуя Зеўса Алімпійскага, маўзалей у Галікарнасе, Калос Радоскі **(на фота)**, Александрыйскі маяк на востраве Фарос.

**Ірына ПРЫМАК.**

ЗВЯЗДА

# АДРАДЖЭННЕ — ГЭТА КЛОПАТ ПРА СЁННЯ

**У калядныя дні ў Беларусі ёсць добрая традыцыя адзначаць найлепшае ў духоўнай сферы. Днямі кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ўручыў сем прэмій «За духоўнае адраджэнне» і 21 спецыяльную прэмію Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва за 2006 год. Якое значэнне маюць гэтыя прэміі для тых, хто іх атрымаў, як наогул сёння дзяржава падтрымлівае айчынную культуру — пра гэтае і іншае ішла размова ў чарговай «Прамой лініі» «Беларускага радыё» (па серадах у 9 гадзін 10 хвілін раніцы), у якой, як звычайна, бярэ ўдзел і газета «Звязда». На гэты раз госцем праграмы стаў дырэктар рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і мастацтва», лаўрэат спецыяльнай прэміі «За духоўнае адраджэнне» 2006 года Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.**

*— Нацыянальная культура сёння разглядаецца як найважнейшы стратэгічны рэсурс дзяржавы, — заўважыў на пачатку праграмы яе вядучы* ***Максім УГЛЯНІЦА.*** *— Яе высокі ўзровень — аснова для фарміравання спрыяльнага жыццёвага асяродку нацыі. Без апоры на высокую культуру наўрад ці атрымаецца выхаваць грамадзяніна, патрыёта, добрага сем'яніна, ды і проста творчую і духоўна-багатую асобу. Як ні дзіўна на першы погляд, але без высокай культуры не можа быць і эфектыўнай эканомікі. Цывілізаваную эканоміку можа стварыць толькі цывілізаваны, высокакультурны чалавек. Значыць, культура — гэта аснова грамадства. Задача ўлады — стварыць аптымальныя ўмовы для развіцця ўсіх відаў мастацтва і культуры з улікам рэальных магчымасцяў. Прэзідэнт краіны неаднаразова падкрэсліваў: ніводны музей, ніводны дом культуры, ніводная іншая ўстанова культуры краіны не была зачынена за апошнія гады. Усё, ад дзіцячых калектываў да сучасных тэатраў, падтрымліваецца дзяржавай. Прэмія «За духоўнае адраджэнне» — яшчэ адно сведчанне такой падтрымкі на самым высокім узроўні.*

— Гэта сапраўды так, — **пагадзіўся госць праграмы Алесь КАРЛЮКЕВІЧ, дарэчы, колішні «звяздовец» і галоўны рэдактар «Чырвонай Змены».** — Прэмія «За духоўнае адраджэнне» — высокая маральная ацэнка калектыву, які працаваў над праектам «В поисках утраченного» амаль тры гады і будзе надалей працягваць сваю работу. Вельмі прыемна, што гэты газетны праект заўважаны і ўшанаваны.

**— Спадар Алесь, што такое для вас — духоўнае адраджэнне?**

— Для мяне гэта — клопат пра сённяшні час. Таму што вельмі шмат мы гаворым пра адраджэнне пэўных традыцый, пра вяртанне пэўных гістарычных часоў, але ўсё гэта павінна разумецца ў кантэксце сучаснасці. Вельмі цікавае параўнанне прывёў Прэзідэнт, віншуючы лаўрэатаў, звяртаючыся да народа краіны на гэтай урачыстай цырымоніі, калі расказаў вядомую прытчу пра зярнятка, якое ўпала ва ўрадлівую глебу і стала залатым коласам. Духоўнае адраджэнне — гэта высокая, напружаная праца, вяртанне лепшага, што было ў ранейшых часах і засвойванне ўсяго маральнага, духоўнага, што працягвае развіццё чалавецтва, грамадства, асобы.

**— Раскажыце, як нарадзіўся праект, за які вы былі ўзнагароджаны, і што ён сабой уяўляе.**

— Генератар праекта — галоўны рэдактар газеты «Советская Белоруссия» Павел Якубовіч. Ён прыдумаў ідэю, знайшоў калекцыянера Уладзіміра Ліхадзедава, без якога таксама не было б нічога. Таму што Уладзімір Ліхадзедаў — вядомы ў краіне збіральнік, ён сабраў калекцыю паштовак беларускіх, у якой больш за 10 тысяч асобнікаў. Напэўна, гэта самая вялікая такая калекцыя ў Беларусі, а магчыма, і ў свеце. Свае паштоўкі Уладзімір Ліхадзедаў знаходзіць у розных гарадах Еўропы: у Санкт-Пецярбургу, Маскве, Кіеве, Варшаве, Мюнхене... Дарэчы, яго запрашаюць на кансультацыі па пытаннях філакартыі кнігавыдаўцы...

**— Цікава і тое, што Уладзімір Ліхадзедаў — прадпрымальнік.**

— Гэта, відаць, вельмі адухоўлены прадпрымальнік, які ўзвысіўся над матэрыяльнымі рэчамі і хацеў бы паўплываць сваім калекцыянерскім зборам на выхаванне і чытача, і грамадства.

Праект «В поисках утраченного» ўяўляе сабой публікацыю рэпрадукцый паштовак, на якіх былі альбо пэўнага рэгіёна, альбо пэўнага паселішча, альбо пэўнай тэматыкі. Напрыклад, паштоўкі да Раства Хрыстова. І падаецца тэкст, які ўяўляе сабой журналіцкае эсэ, карэспандэнцыю, каментарый, часам і рэпартаж, калі гэта звязана з пэўнай падзеяй. Аўтарам тэкстаў, дарэчы, выступаў не толькі я.

**— Што было спачатку — паштоўка альбо тэкст?**

— Па-рознаму. Часам Уладзімір Ліхадзедаў, у добрым сэнсе слова, навязваў тэму. Часам аўтары прапаноўвалі яму, пра што напісаць.

**— Ці сталі нейкія паштоўкі адкрыццём асабіста для вас?**

— Безумоўна. Такім адкрыццём для мяне сталі выявы, якія расказвалі пра побыт мястэчка Пухавічы, сёння звычайнай вёскі: рынак, брук, вуліца, самі мясціны пухавіцкія. Вельмі цікавыя ёсць паштоўкі, прысвечаныя колішняму мястэчку, нават цэнтру раёна, сёння зноў ужо вёсцы — Шацк. На адной з іх я ўбачыў беспрытульнае дзіця ў Шацку... Вельмі шмат цікавых паштовак, і многія з іх былі для мяне адкрыццём, якія звязаныя з публікацыямі аб Полацку. Сёння ўвогуле ўражвае Полацк і тое, што там робіцца па адраджэнню архітэктуры, па сучаснаму абнаўленню вуліц горада. Паштоўкі, на якіх адлюстравана даўняя, пачатку XX стагоддзя, архітэктура, напрыклад, масты цераз Дзвіну, далі нейкае новае ўспрыманне часу.

**— Якія водгукі паступалі ад чытачоў?**

— Людзі просяць, каб мы выдалі кнігу са старымі паштоўкамі Беларусі, на якіх выявы самых розных мясцін. Некаторыя просяць, каб з'явілася публікацыя менавіта пра іх мясціны, падказваюць крыніцы інфармацыі. Так нарадзіўся матэрыял пра Новую Ельню, пра чыгунку ў Наваградку. Шмат было зваротаў да Уладзіміра Ліхадзедава з боку краязнаўцаў, музейных работнікаў, настаўнікаў па рэпрадукцыі тых ці іншых паштовак для афармлення музейных экспазіцый. Дарэчы, зараз працуюць выстаўкі ў Глыбокім, Мар'іна-Горацкай гімназіі і Полацкім дзяржаўным універсітэце, якія складзены з рэпрадукцый паштовак з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава. У Мар'інай Горцы гэта экспазіцыя стане асновай будучага музея.

**— Якім яшчэ чынам працягваецца праект?**

— Зараз я працую ў рэдакцыйна-выдавецкай установе «Літаратура і мастацтва», і ў часопісе «Маладосць», які ўваходзіць ў гэтую ўстанову, пачынаючы з 10-га нумара друкуюцца паштоўкі на другой і трэцяй старонках вокладкі. Калі адкрывалася экспазіцыя на гістарычна-філалагічным факультэце Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, то там праводзілася прэзентацыя часопіса «Маладосць», які быў прысвечаны цалкам Полачыне і часткова аформлены з дапамогай рэпрадукцый старых паштовак з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава.

**— Ці з'явіцца ўсё ж такі кніга?**

— Гэта залежыць, у першую чаргу, ад Уладзіміра Ліхадзедава, ад падтрымкі газеты, у якой з'явіўся праект, і ад грамадскага рэзанансу, які нададзены гэтай вялікай духоўнай справе.

**— Назва, дарэчы, даволі песімістычная — тое, што страцілі, таго ўжо няма.**

— Нас крытыкавалі за гэтую назву. Але з часам назва робіцца нечым большым, чым назва. Аднойчы мы сказалі, што жадаем нешта вярнуць ілюстрацыяй, пацказаць, як яно раней было, без усялякіх сацыяльных ці ідэалагічных паралеляў. Тым не менш адбылося развіццё гэтай назвы. Сёння кожны шукае ў ёй самы розны кантэкст. На самай справе я думаю, што няма тут ніякага песімізму. Размова з нашага, журналісцкага, газетнага пункту гледжання пра тое, што мы жадаем падаць ілюстрацыю пэўнага часу.

**— Спадар Алесь, як на ваш погляд трэба ставіцца да страчанага ў больш шырокім, філасофскім сэнсе гэтага слова?**

— Скажу коратка: трэба ставіцца з пэўнымі перажываннямі і думамі пра будучае ўзнаўленне і развіццё.

**— Вы згодны з тым, што ўстойлівае развіццё грамадства, дзяржавы магчыма толькі, калі будзе павялічвацца духоўнасць і маральнасць?**

— Безумоўна, і вельмі прыемна, што дзяржава вялікую ўвагу надае гэтаму, і тое, што ў праекце прэміі «За духоўнае адраджэнне» ўздельнічае і дзяржава, і Царква. Важна, што многім сваім тарам дадзена гэтая высокая ўзнагарода, адзначана іх праца па духоўнаму фарміраванню чалавека. Невыпадкова і тое, што на самым пачатку года гэтаму нададзена вялікая ўвага, хоць у грамадства столькі сацыяльных, эканамічных, самых розных праблем.

**— На ўручэнні прэміі Прэзідэнт назваў 2006 год плённым для майстроў культуры, і сярод асноўных дасягненняў адзначана адкрыццё духоўнай скарбніцы — Нацыянальнай бібліятэкі, новага корпуса Нацыянальнага мастацкага музея...**

— Сапраўды, гэтыя падзеі ўражваюць. Нацыянальная бібліятэка стала візіткай нашай краіны. Мне давялося бачыць, з якой вялікай цікавасцю яе аглядалі госці з Балгарыі, Сербіі, Расіі, Украіны і іншых краін, якія прыязджалі нядаўна на з'езд Саюза пісьменнікаў Беларусі, як яны былі ўражаны ад стаўлення нашай дзяржавы да духоўнасці, асветніцтва і культуры народа. Што датычыцца Мастацкага музея, то там столькі сёння адбываецца падзей, што ледзьве паспяваеш за імі сачыць і гэта таксама вялікі ўклад у развіццё чалавека, яго духоўнасці. Калі б гэтага не рабілася, тады мы б страцілі намнога больш.

**У «прамой лініі»**
**брала ўдзел**
**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Слухай сваё

# НА МУЗЫЧНЫМ ФРОНЦЕ... З ПЕРАМЕННЫМ ПОСПЕХАМ

Зборнік «Беларускі саюз» усё пашыраецца — калі не ў геаграфічным, то ў колькасным сэнсе дакладна. Другая яго частка паспела выйсці ў свет у рэкордна сціслыя тэрміны і была нядаўна паспяхова прэзентавана ў сталічным клубе «Мілленіум». Прычым выступалі артысты, паводле традыцыйнай ужо завядзёнкі і строгіх патрабаванняў клуба, выключна ўжывую.



Pin-Code.

«Саюзнікаў» на гэты раз набралася 23 артысты і калектывы. Прычым на першы погляд узнікае адчуванне дэжа вю — у трэклісце, як і на мінулай складанцы, усё тыя ж Аня Шаркунова і Паліна Смолава, Саша Нэма і Дзіма Карпінчык, «Топлес» і «J:Морс», Леся Кодуш і Слава Нагорны... Аднак калі ўглядзецца больш уважліва, у спісе трапляюцца таксама новыя імёны і нават сапраўдныя адкрыцці. Нязменным застаўся толькі прынцып адбору: кампазіцыі, якія найбольш рацыруюцца на айчынных радыёстанцыях. Увогуле, «Беларускі музычны Саюз-2» можна лічыць своеасаблівым індыкатарам: трапіў артыст на зборнік — значыць, нешта робіць у новым сезоне, працуе сабе на славу і слухачам на радасць; знік выканаўца са спісу — расслабіўся, відаць, або не паспеў падрыхтаваць нічога новага, трэба браць сябе ў рукі і вяртацца ў музычную абойму, пакуль на цябе не забыліся...

Адным з адкрыццяў, напрыклад, стаў чарговы праект рэперскай пары Повара і Ніны — калектыў Pin-Code з песняй «Разумныя, прыгожыя» («Танго»). Відаць, творчы і сямейны дуэт вырашыў даказаць нядобразычліўцам, што здольны на большае, чым выконвацьгімн «Суперлато». Гэта атрымалася. Што адметна, разам з удзельнікамі гурта на прэзентацыі паказалася экс-салістка «Топлес» Наташа Дзяруга (яна знялася і ў кліпе на песню Pin-Code). Хвілін дванаццаць дзяўчына стаяла падкрэслена наводдаль ад былых «аднагрупніц», потым сустрэча на Эльбе ўсё ж адбылася. Тварам ніхто нікому не біў, хоць і асаблівай прыязнасці сярод спявачак не назіралася.

Як мы і прадказвалі яшчэ пасля першага «Саюза», на другую частку трапіла песня Наташы Пальчэўскай з рэкордна доўгай назвай «Проста ты тая дзяўчына, якая яго заводзіць». Наталля змяніла імідж рамантычна-баладнай спявачкі на штосьці іншае, як быццам гламурнае, але пакуль да канца не зразумелае.

Адпаведным чынам была ацэнена творчая актыўнасць спявачкі Венеры (яна ж Наталля Кудрына) і гурта «Дразды», без якіх апошнім часам не абыходзіцца ніводны зборнік канцэрт. Па традыцыі, знайшлося месца і для «замежных» праектаў — Б'янкі і Про100 Мары. Але больш за астатніх парадавала ўсё ж Гюнеш Абасава, якая прадставіла на прэзентацыі не толькі новы хіт «Хабібі», але і новы імідж — без пяці хвілін бландзінка. Да таго ж, Гюнеш аказалася адзінай, хто спыніў уласную песню гучным крыкам «Стоп! Фанера-а!» і, папрасіўшы ў слухачоў прабачэння, з сур'ёзным выглядам паабяцала спяваць толькі жывым — «пастаўце, калі ласка, мінусавую фанаграму».

«Беларускі музычны Саюз-3», мяркуючы па набраных тэмпах, можа чакаца ўжо ў ліпені-сакавіку — і я так мяркую, што большасць яго ўдзельнікаў не стане для нас сюрпрызам.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Муз-news

## «Машына часу» з эфектам тармажэння

Гурт «beZ bileta» выпускае новы кліп — на песню «Такія павольныя». Відэа, знятае вядомым беларускім кліпмейкерам Максімам Сірым, як заўжды, атрымалася сімвалічным і канцэптуальным (ну не цягне музыкантаў да спрашчэння). Вынік ужо можна скачаць з сайта bezbileta.com, а песня дакладна трапіць на новы альбом, выхад якога запланаваны на вясну.

Здымкі праходзілі халодным ранкам на праезнай частцы непадалёк ад Мінскай кальцавой дарогі — прычым удзел у іх узялі не толькі самі музыканты, але таксама сябры і прыхільнікі гурта. У адпаведнасці з духам песні, рэжысёр вырашыў... запаволіць час. Тэхналогію гэтай справы музыканты не раскрываюць — лічаць, што ўсё стане зразумела пасля прагляду.

## Дваццаць адзін і сто пяцьдзесят адна



Спявачка Улада нядаўна адзначыла дзень нараджэння — ні многа, ні мала, а 21 год, самае поўнае з усіх прыдуманых паўналецце. Родныя і сябры падышлі да святкавання адказна, адзначалі дату чатыры дні і надарылі дзяўчыне сапраўдную гару падарункаў — і для душы, і для вучобы, і для работы.

Напрыклад, самы дарагі «рабочы» падарунак Уладзе зрабіў яе прадзюсар Сяргей Ждановіч — залацісты «фіат» як быццам спецыяльна прыдуманы, каб яго новая гаспадыня ўсё паспявала. Справа за малым — атрымаць правы (што Улада і мяркуе зрабіць у сакавіку, а пакуль займаецца аздабленнем салона). Бацькі прэзентавалі новы камп'ютар — верны памочнік у атрыманні вышэйшай адукацыі. Аднак усіх «перадарыў», ва ўсякім выпадку, з дзявочага пункту гледжання, рыцар сэрца спявачкі — ён прэзентаваў Уладзе залаты пярсцёнак і... 151 ружу.

## Лепшы падарунак, акрамя жартаў



Вядомая спявачка Вольга Плотнікава нарэшце прызналася афіцыйна, што чакае дзіця — зараз яна на шостым месяцы цяжарнасці, а з'яўленне на свет немаўляці (ужо вядома, што гэта будзе дзяўчынка), чакаецца ў красавіку — акурат першага чысла. «Мы так доўга маўчалі, бо гэта дзіця сапраўды вельмі доўгачаканае, і мы баяліся сурочыць», — тлумачыць спявачка.

Зараз Вольга і яе муж, кампазітар Генадзь Маркевіч, прыглядваюць мэблю для дзіцячага пакойчыка і спрачаюцца наконт імя будучай дачушкі. У прынцыпе, адзін варыянт імені ўжо быў зацверджаны на сямейнай нарадзе, але потым яно падалося занадта звычайным — зорныя бацькі хочуць назваць дзіця як-небудзь неардынарна. Разам з тым Вольга Плотнікава не збіраецца пакідаць сцэну і сцвярджае, што будзе працаваць да апошняга — толькі ў навагоднія святы спявачка паспела «засвяціцца» ва ўсіх без выключэння значных тэлепраектах.

## Штучны снег і «натуральнае» караоке

Аляксей Хлястоў, які наладзіў прэзентацыю свайго другога альбома «Таму што я кахаю» акурат у ноч на праваслаўнае Ражство, вырашыў хоць неяк кампенсаваць сябрам і прыхільнікам «незімовы» настрой — падчас канцэрта ў клубе пачаўся... снегапад. Праўда, снег быў штучны — але што рабіць, калі сапраўдным нас прырода не радуе. Аляксей шчыра адпрацаваў праграму сам і прадставіў публіцы свае новыя песні — «Па секундах і хвілінах», «Сняжынкі», «Дзве зоркі», а пасля саступіў сцэну сябрам — Іскуі Абалян, Сашу Нэма, Алесі, гурту «Тяни-Толкай», Ільі Міцько. Да таго ж некаторыя артысты мелі магчымасць «адчуць сябе Хлястовым» — выканаць у рэжыме караоке песні з рэпертуару Аляксея. Зразумела, не абышлося без падарункаў: так, ад Іскуі Абалян спявак і яго жонка атрымалі сапраўдны калядны сувенір — дзве свечкі з Храма Гасподня ў Іерусаліме, Паліна Смолава па традыцыі прынесла экзатычна-гаршэчную расліну, Corriana па асацыяцыі з песняй падарыла кветку папяровую — праўда, зробленую ўласнаручна. І толькі аранжыроўшчык Андрэй Сланчынскі прывёз з Масквы рэч не проста забаўную або кранальную, а сапраўды карысную для кожнага артыста — радыёмікрафон.

**Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# ПРА АСТЭРОІДНА-КАМЕТНУЮ НЕБЯСПЕКУ, ЧОРНЫЯ ДЗІРКІ І НЕ ТОЛЬКІ...

**Прынята лічыць, што астраномія як навука зарадзілася ў Егіпце і Міжрэччы каля 2 тысяч гадоў да нашай эры. Аднак яшчэ ў XVIII стагоддзі французскі вучоны Балі выказаў меркаванне, што радзіма астраноміі знаходзілася ў Сібіры. Апошнія даследаванні пацвердзілі гэта.**



Калаж Аляксандра АСІПЕНКІ.

## КАЛЫСКА АСТРАНОМІІ

— Калі ў савецкія часы шукалі месца пад касмадром, разглядалі некалькі варыянтаў, у тым ліку і тэрыторыю Сібіры, — распавядае дырэктар Абсерваторыі БДУ, кандыдат фізіка-матэматычных навук Ольгерд Паўлавіч Кузнечык. — Побач з Уральскімі гарамі з самалёта былі заўважаны не характэрныя для гэтай мясцовасці ўзвышэнні — як высветлілася потым — штучнага паходжання. У выніку касмадром вырашана было будаваць у Казахстане, а ля Уральскіх гор у працэсе археалагічных работ была раскапана цэлая краіна גарадоў, першы з якіх атрымаў назву Аркаім, што ў перакладзе з санскрыта азначае «маленькае неба». Сёння там адкрыты аднайменны запаведнік тэрыторыяй 100 на 300 кіламетраў уздоўж паўднёвай аканечнасці Уральскіх гор.

2 тысячы гадоў да н.э. у «Маленькім небе» віравала жыццё. Насялялі Аркаім індаарыі, частка якіх потым сышла ў Індыю. У Сібіры яны будавалі гарады з канцэнтрычнымі вуліцамі, дзе дамы мясціліся па акружнасці (прычым хадзіць можна было не толькі па зямлі, але і па дахах). Індаарыі Аркаіма ўжо 2 тысячы гадоў да н.э. мелі плавільныя печы і натуральныя халадзільнікі, умелі ачышчаць адпрацаваную ваду, прапускаючы яе праз прыродныя адсарбенты. Яны ўжывалі ў ежу зерневыя культуры і жылі ў сярэднім па 70 гадоў, што зусім не стасуецца з нашымі падручнікамі па гісторыі. У Аркаіме была знойдзена старажытная абсерваторыя і зроблення рукой тагачасных астраномаў меткі, якія дазвалялі вызначаць усход і захад сонца, час сонцастаяння і раўнадзенства, а таксама прадбачыць месяцовыя і сонечныя зацьменні. У Аркаіме паспелі пабываць навуковыя экспедыцыі з розных краін Еўропы і Азіі, але шырокага грамадскага рэзанансу гэта не дало: сваім існаваннем Аркаім адвяргае класічную версію зараджэння навукі астраноміі і цывілізацыі ўвогуле.

— Яшчэ адным доказам правоты астранома Балі стаў знойдзены ў Сібіры, пад Ачынскам, бівень — так званае Ачынскае жазло, якому прыблізна 40 тысяч гадоў, — працягвае Ольгерд Паўлавіч. — Нанесеныя на ім знакі дазвалялі вылічаць сонечныя зацьменні з дакладнасцю да дня (цыкл Сараса). Усе гэтыя археалагічныя знаходкі сведчаць пра тое, што ў старажытнасці ў Сібіры існавала высокаразвітая цывілізацыя, якая валодала ў тым ліку і астранамічнымі ведамі.

## ВОБЛАКА-НЕВІДЗІМКА

Абсерваторыя пры БДУ была адкрыта 1 сакавіка 1992 года. Да таго вывучэннем зор і планет займалася група астраномаў пры кафедры электрафізікі БДУ. Адным з накірункаў іх дзейнасці ў савецкі час было даследаванне фону неба ў інфрачырвоным дыяпазоне з мэтай выяўлення прыродных і штучных касмічных аб'ектаў (у тым ліку і спадарожнікаў-шпіёнаў). Даследаванне фону неба праводзілася паралельна вучонымі Ленінграда (з аэрастатаў), Казані (з самалётаў, верталётаў) і Мінска (з зямлі). Падобныя работы былі піянерскім прарывам на тэрыторыі Саюза і насілі паўадкрыты характар.

Дзякуючы таму, што беларусы ў адрозненне ад ленінградскіх і казанскіх спецыялістаў назіралі за ўсімі слаямі атмасферы, яны зрабілі цікавае адкрыццё: «убачылі» абЛокі, якія нябачны ва ўспрымаемым вокам дыяпазоне, і якія нельга выявіць нават з дапамогай звычайнай оптыкі. Размова ідзе пра некандэнсацыйныя абЛокі, якія амаль не маюць у сваім складзе вады, а толькі малекулы газаў атмасферы і пыл. Іх можна назваць протаабЛокамі ці зародкамі абЛокаў, але ў адрозненне ад эмбрыёнаў жывых істот такія абЛокі могуць існаваць як самастойныя аб'екты. Навуковы свет не адразу сур'ёзна аднёсся да гэтага адкрыцця — занадта сенсацыйным яно падалося. Затое яно мела значэнне для «абаронкі» — некандэнсацыйныя абЛокі можна было б прыняць за штучны варожы аб'ект. З адпаведнымі наступствамі.

## НЛА СТВАРАЛІ ЛЮДЗІ?

У 80-я гады беларускія астраномы ў межах праграмы вывучэння фону неба рэгулярна выязджалі ў Крым, дзе на гары Кошка (ля Сімеіза) знаходзілася старая крымская абсерваторыя. Там на невялікай адлегласці былі ўстаноўлены 2 лазерныя сістэмы па выяўленню прыродных і штучных касмічных аб'ектаў (грамадзянская — для карэкціроўкі руху інфармацыйных спадарожнікаў і ваенная — для выяўлення варожых спадарожнікаў-шпіёнаў). Задачай сістэм было трапіць лазерным промнем у спадарожнік, атрымаць адбіты сігнал і па ім вызначыць каардынаты аб'екта. Перад увядзеннем абедзвюх сістэм у працоўны рэжым іх трэба было адрэгуляваць, для гэтага ў гарах на адлегласці 5 кіламетраў устанавілі вялізнае люстра. На яго наводзілі лазерныя промні і па адбітым сігнале карэкціравалі амплітуду і шырыню імпульсу. Справа была летам, закаханыя парачкі часта шукалі адасаблення ў гарах, і калі раптоўна з цемры на іх накіроўваліся чырвоны і зялёны промні, людзі ўяўлялі, што трапілі пад абстрэл НЛА. «Чуткі пра гэта потым гулялі па ўсіх навакольных пляжах, — расказвае Ольгерд Паўлавіч. — Але нам было забаронена размаўляць на гэтую тэму з мясцовымі жыхарамі. Самі мы за ўсе гады назірання за фонам неба НЛА не бачылі».

## ТУНГУСКІ МЕТЭАРЫТ АКАЗАЎСЯ КАМЕТАЙ?

Акрамя НЛА павышаную цікавасць людзей ва ўсім свеце выклікаюць каметы і метэарыты, а таксама звязаныя з імі верагодныя катастрофы.

— Першая хваля трывалага інтарэсу грамадскасці да малых нябесных целаў з'явілася пасля падзення Тунгускага метэарыта ў 1908 годзе, — распавядае дырэктар Абсерваторыі БДУ. — Яшчэ адно значнае падзенне адбылося ў 1947 годзе ў гарах Сіхатэ-Алінь. Прычым многія да гэтай пары лічаць, што ў Тунгускім трохвугольніку прызямлілася НЛА, бо там не было знойдзена рэшткаў аплаўленага рэчыва метэарыта — тыктытаў. Я ж падзяляю думку тых вучоных, хто лічыць Тунгускі метэарыт каметай. Пры ўваходзе ў атмасферу Зямлі адбылося рэзкае тармажэнне і адначасовае награванне каметы. Яе ядро раскалолася на тры часткі (сведкі падзення чулі менавіта тры асобныя гулы), а сама атмасфера каметы ўспыхнула, пры гэтым у ёй згарэлі ўсе кавалкі ядра. Ударная хваля павaліла лес, вось чаму ні адна экспедыцыя не знайшла там тыктытаў.

Зараз панічныя настроі ў многіх уразлівых асоб выклікае набліжэнне да Зямлі астэроіда Апофіс (зарэгістраванага як MN-4-99942) дыяметрам 390—400 метраў. Да Зямлі ён наблізіцца ў 2029 годзе. Паводле адной з версій, Апофіс можа сутыкнуцца з нашай планетай, што прывядзе да катастрофы.

— Я б пачакаў панікаваць, — адзначае Ольгерд Паўлавіч. — У бліжэйшы час на Апофісе з дапамогай зонда будзе ўстаноўлены радыёмаяк, які дапаможа больш дакладна вызначыць траекторыю астэроіда, і зроблены забор грунту, што дасць інфармацыю аб шчыльнасці яго структуры. Зыходзячы з гэтага, можна будзе распрацоўваць канкрэтны план дзеянняў. У Расійскай Федэрацыі ўжо створана праграма «Астэроідна-каметная бяспека Расіі», куды падключаны каля 30 установаў і навукова-вытворчых комплексаў. Асноўная іх задача зараз — прадухіленне катастрофы з-за магчымага сутыкнення з Апофісам. Беларускія астраномы плануюць распрацаваць свой праект і прадставіць на разгляд расіянам. Будзем спадзявацца на плённае супрацоўніцтва ў гэтым накірунку.

## АСТРАНОМІЯ ДЛЯ ДАШНІКАЎ

Даследаванні беларускіх астраномаў вельмі цікавяць работнікаў ДАІ. Вопытны следчы пры разборы ДТЗ абавязкова накіруе запыт не толькі ў гідраметэацэнтр (за інфармацыяй аб тэмпературы паветра, вільготнасці, сіле ветру, гарызантальнай бачнасці і г.д.), але і ў Абсерваторыю БДУ — пацікавіцца асветленасцю на момант здарэння, фазай Месяца і інш. Усё гэта неабходна для таго, каб следчы эксперымент потым быў праведзены карэктна.

— Да нас часта звяртаюцца за інфармацыяй пракуроры, следчыя, адвакаты, нават суддзі, — пацвярджае Ольгерд Паўлавіч. — Мы прадастаўляем звесткі аб знаходжанні Сонца і Месяца над гарызонтам, аб ступені асветленасці, аб фазе Месяца і інш.

## САКРЭТ ЧОРНАЙ ДЗІРКІ

Пра чорныя дзіркі чулі ўсе, але ніхто пакуль не можа дакладна растлумачыць, што гэта такое. Магчыма, беларускія вучоныя ў бліжэйшыя гады раскрыюць гэтую таямніцу.

— Апошнія даследаванні паказалі, што практычна ва ўсіх цэнтрах галактык ёсць актыўныя чорныя дзіркі, — гаворыць аспірант Абсерваторыі БДУ, магістр прыродазнаўчых навук Аляксандр Паплаўскі. — Аднак пакуль незразумела, чаму ў адным выпадку паблізу ад гэтых чорных дзірак адбываюцца нейкія працэсы, а ў другім (як у нашай галактыцы) — чорная дзірка знаходзіцца ў спакоі. Мы ўжо наблізіліся да разгадкі і праз год-два зможам адказаць адназначна. Пакуль выкажу меркаванне: калісьці наша чорная дзірка была актыўная, але потым адбыўся магутны выбух, які выдаліў усё рэчыва з яе асяроддзя. На яе нічога не падае, нічога не ўзаемадзейнічае».

## АДКУЛЬ БЯРУЦЦА МАГНІТНЫЯ БУРЫ?

— Магнітасфера Зямлі з'яўляецца для нас своеасаблівай «лініяй абароны» перад жорсткім выпраменьваннем (гама, рэнтгенаўскія промні), — тлумачыць Ольгерд Кузнечык. — Генерыруецца магнітнае поле Зямлі за кошт унутраных працэсаў, што працякаюць у двух паясах на глыбіні 2900 і 60 кіламетраў. Калі гэтыя працэсы спыняцца, наша планета страціць магнітасферу і ўсё жывое будзе спалена.

Магнітасферу Зямлі можна вобразна параўнаць з ахоўнай абалонкай яйка, толькі ў адрозненне ад шкарлупіны, магнітасфера можа дэфармавацца (сціскацца і расцягвацца) пад уздзеяннем сонечнага ветру. З таго боку, дзе Сонца асвятляе нашу планету (у адным паўшар'і дзень) магнітасфера сціскаецца да 10 радыусаў Зямлі, а з процілеглага боку (там, дзе ў другім паўшар'і ноч) — расцягваецца да некалькіх сотняў зямных радыусаў. Зямля і Сонца круцяцца вакол сваёй асі, Зямля — вакол Сонца, дзень змяняе ноч, магнітасфера пастаянна дэфармуецца. У такім «ссунутым» магнітным полі мы жывём пастаянна, але не адчуваем ніякіх негатыўных уздзеянняў.

У выніку ўнутраных ядзерных працэсаў на паверхні Сонца часам узнікаюць плямы, якія ў сваю чаргу прыводзяць да выкідаў згусткаў сонечнай плазмы. Паток высокаэнергетычных часціц ўрываецца ў атмасферу Зямлі і ўзаемадзейнічае з іонасферай. Пранікненне звычайна адбываецца ў 10-20 градусах ад паўднёвага ці паўночнага палюсоў (у таксама ў кропках ранімасці). Тады мясцовыя жыхары могуць назіраць рэдкую прыродную з'яву — паўночнае (паўднёвае) ззянне. У першую чаргу выкід плазмы Сонца ўплывае на геастацыянарную арбіту (35 600 кіламетраў ад паверхні, дзе звычайна размяшчаюцца ваенныя і інфармацыйныя спадарожнікі). У залежнасці ад магутнасці выкіда можа часова перарвацца сувязь са спадарожнікам, пашкодзіцца электрарадыёапаратура. Бывалі выпадкі, калі моцная ўспышка папросту знішчала спадарожнік.

— З Зямлі ўспышку на Сонцы мы бачым праз 8,3 хвіліны, — працягвае Ольгерд Паўлавіч. — Змяненне магнітнага поля планеты адбываецца праз 1,5—2 сутак (магнітныя буры). Нервовая сістэма адных людзей рэагуе адразу. У некаторых — з невялікім спазненнем на суткі ці двое. Магчыма, гэта абумоўлена тым, што пасля ўспышкі магнітасфера заспакойваецца не адразу, адбываецца яе пульсацыя.

Нейтралізаваць змяненне магітасферы Зямлі людзі не навучыліся, затое яны могуць прадказаць чарговую магнітную буру. А папярэджаны — значыць узброены.

...Накірункаў працы ў беларускіх астраномаў шмат. Пра ўсе адразу не раскажаш. Наперадзе — новыя таямніцы і новыя адкрыцці.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

# Inter-ПОЛ

## АФЕРЫСТКА «КАСІЛА» ПАД МІЛЬЯНЕРШУ

**У Ньюкасле перад судом прадстала шлюбная аферыстка, якая выцаганіла з кішэняў сваіх выбраннікаў больш за 100 тысяч фунтаў. Эма Гаўлайтлі знаходзіла багатых адзінокіх мужчын праз сайты знаёмстваў ці аб'явы ў газетах.**

Жанчына прадстаўлялася ім паспяховай прадпрымальніцай і завязвала з ахвярамі палюбоўныя адносіны, заваёўваючы іх прыхільнасць каштоўнымі падарункамі. Затым яна паведамляла сваім выбраннікам аб тым, што ў яе рак у апошняй стадыі, што жыць засталося нядоўга, але ёй хацелася б хоць крыху пабыць у шлюбе. Прыхільныя нязменна пагаджаліся з ёй ажаніцца. Пасля вяселля ахвяры выявілі, што ўсе падарункі, урачыстая цырымонія і мядовы месяц на экзатычных курортах аплачваліся з іх уласнай кішэні. Урэшце рэшт пацярпелыя звярнуліся з іскамі ў суд. Гаўлайтлі прад'яўлены абвінавачанні па 60 эпізодах махлярства.

## ПАЛІЦЫЯ «ПАЛЯВАЛА» НА ПІТБУЛЯЎ

**У выніку спецаперацыі, праведзенай у прыватных уладаннях графства Мерсісайд, паліцыя Вялікабрытаніі канфіскавала ў гаспадароў 18 байцоўскіх сабак пароды пітбуль.**

У рэйдзе ўдзельнічалі 60 супрацоўнікаў паліцыі і каля 30 прадстаўнікоў Каралеўскага таварыства абароны жывёл ад жорсткага абыходжання. Сем чалавек былі арыштаваны згодна з палажэннямі Закона аб небяспечных сабаках ад 1991 года, які забараняе трымаць пітбуляў, а таксама сабак яшчэ трох байцоўскіх парод. Паводле слоў старшага паліцэйскага афіцэра Дэйва Конара, многія ў Вялікабрытаніі заводзяць байцоўскіх сабак для прэстыжнасці, каб падкрэсліць свой сацыяльны статус. Рэйды былі праведзены пасля шматлікіх інцыдэнтаў, у ходзе якіх байцоўскія сабакі нападалі на людзей, у тым ліку на сваіх гаспадароў. Адной з ахвяр стала пяцігадовая Элі Лоўрэнсан, якую ў навагоднія святы разарваў хатні любімец — пітбуль.

## ЖАНЧЫН АБВІНАВАЦІЛІ Ў ВЯДЗЬМАРСТВЕ...

**Паліцыя Усходняга Цімора арыштавала трох чалавек па падазрэнню ў забойстве. Следства мяркуе, што яны маюць дачыненне да гібелі трох жанчын, якіх затрыманыя абвінавацілі ў вядзьмарстве.**

Інцыдэнт адбыўся ў горадзе Лікіка, размешчаным за 40 кіламетраў на захад ад сталіцы краіны Дзілі. Тры жанчыны ва ўзросце 70, 50 і 25 гадоў былі абвінавачаны ў вядзьмарстве і забіты, а іх дамы спалены. У расследаванні таксама прымаюць удзел прадстаўнікі міратворчых сіл ААН, якія былі ўведзены ў краіну летась для папярэджання беспарадкаў. Спальванне вядзьмарак стала першым падобным выпадкам на Усходнім Цiморы, насельніцтва якога ў большасці — каталікі.

## СУД АПРАЎДАЎ ЗЛАДЗЮЖКУ

**Суд грэчаскага горада Іракліён на востраве Крыт вынес вердыкт на справе аб незвычайным крадзяжы. Беспрацоўны малады чалавек выкраў сумку ў студэнткі, аднак усяго праз некалькі хвілін пасля гэтага з'явіўся з пакаяннем у паліцэйскі ўчастак.**

На допыце малады чалавек паведаміў, што пайшоў на злачынства таму, што прымае сінтэтычныя стымулюючыя прэпараты. У пошуках грошай на чарговую дозу наркаман учыніў злачынства, аднак выявіўшы, што ў выкрадзенай сумцы ўсяго 16 еўра, вырашыў, што лепш будзе здацца паліцыі. Нягледзячы на раскаянне, злодзей быў затрыманы. Пракуратура настойвала на тым, каб прызнаць маладога чалавека вінаватым у дробным крадзяжы. Аднак суд не пагадзіўся з доказамі пракурора і апраўдаў абвінавачанага. Выкрадзеная сумка і грошы былі вернуты студэнтцы.

**Падрыхтаваў Ігар РЫГОРАЎ.**

**Надзвычай насычаным і празмерна эмацыянальным для беларусаў з'яўляецца прамежак часу ад 25 снежня і да 21 студзеня. У гэтым святочна-абрадавым шэрагу падзей як у люстэрку адбілася шматвяковая гісторыя культуры, хрысціянскай Царквы, ідэалогіі, палітыкі. У пэўным сэнсе слова мы апынуліся на скрыжаванні часу і дарог паміж Захад і Усходам. А кожны з вектараў развіцця еўрапейскіх культурных традыцый абапіраўся пераважна на адну з рэлігійных адгалінаванняў. З Захаду мы апынуліся крайнім фарпостам каталіцкага веравызнання, святочна-абрадавы комплекс якога святкаваўся Касцёлам па грыгарыянскаму календару (новаму стылю).**

# ТАЙНЫ СТАРОГА НОВАГА ГОДА

Справа ў тым, што ў 274 годзе н.э. імператар Старажытнага Рыма Аўрэлін прызначыў 25 снежня як дзень нараджэння Сонца. А з 376 года хрысціянская царква запазычыла дзень зімовага сонцавароту для таго, каб называць гэты дзень святам нараджэння Ісуса Хрыста як новага князя Сонца.

Вядома, што да 1582 года грамадзянскі каляндар адставаў ад дня зімовага сонцастаяння на 10 дзён. У сувязі з гэтым Папа Грыгорый XIII правёў рэформу календара, фактычна выкрэсліваючы з жыцця еўрапейцаў тыя ж 10 дзён. Пачынаючы з 1583 года еўрапейскія краіны паступова пераходзяць на новае летазлічэнне — грыгарыянскі стыль.

З усходу Беларусь апынулася фарпостам Рускай праваслаўнай царквы, якая не прыняла рэформы каталіцкага Касцёла, і да нашых дзён застаецца прыхільнікам старога, юліянскага календара (стылю), які быў распрацаваны Юліем Цэзарам і ўведзены ў 46 годзе да н.э. З 1583 года і да пачатку XX стагоддзя розніца паміж юліянскім і грыгарыянскім календарамі складала ўжо цэлых 13 дзён. Такім чынам, каталіцкае Ражство святкуецца ў ноч з 24 на 25 снежня, а праваслаўнае — ў ноч з 6-га на 7 студзеня.

У 1918 годзе У. Ленін спецыяльным Дэкрэтам пераводзіць дзяржаўнае летазлічэнне на еўрапейскі (грыгарыянскі) каляндар. Аднак Руская праваслаўная царква засталася на старым, юліянскім, календары.

Дэкрэт У. Леніна прывёў да ўзнікнення яшчэ аднаго парадокса. Расія, якая на працягу некалькіх стагоддзяў адзначала Новы год па юліянскаму календару, не змагла ў адзін дзень забыць пра свае традыцыі, таму адначасова з Новым годам — па еўрапейскай традыцыі, яна захавала традыцыю адзначаць навалецце і па юліянскаму календару (старому стылю). Гэтае свята атрымала мудрагелістую, але дакладную назву — стары Новы год і святкуецца з 13 на 14 студзеня.


фота Анатоля КЛЕШЧУКА

Грамадзянскі стары Новы год — гэта ні што іншае, як святкаванне Другой каляднай куцці, якая, у адпаведнасці з навагоднім прынцыпам «як сустрэнеш новы год, так яго і пражывеш», атрымала назву Шчодрай, Багатай, Тоўстай куцці, таму навагодняя вячэра атрымала яшчэ адну сімвалічную назву — Шчадрэц або Багатуха.

У сувязі з тым, што праваслаўная Царква 14 студзеня ўшаноўвае дзень смерці аднаго з заснавальнікаў хрысціянства, стваральніка шматлікіх манастыроў Васіля Вялікага, то гэты дзень атрымаў яшчэ адну назву — Святое Васілле. А ў сувязі з тым, што праз нейкі час святы Васіль пачаў лічыцца ахоўнікам свіней, то па традыцыі на калядны стол падавалі «кесарыйскае парася».

Вечарам у стары Новы год праводзіўся абрад дзявочага калядавання, калі вясковыя хаты абходзіў гурт 12—14-гадовых дзяўчат. А вось назаўтра раніцай выконваўся бадай што самы сімвалічны рытуал старанавагодняй і калядняй традыцый — «засеўкі». Гурт вясковых хлопцаў браў некалькі торбачак з зернем жыта, аўса, ячменю і хадзіў па хатах з навагоднімі віншаваннямі. Хлопцы заходзілі ў хату, спявалі калядкі-заклічкі, а тым часам рассыпалі па падлозе па жменьцы зерня кожнай культуры, гучна прыгаворвалі:

*Сею, сею, пасяваю,*
*З Новым годам паздраўляю!..*

Тым самым дбайным, руплівым гаспадарам жадалі дабрабыту, сямейнага шчасця, багатага ўраджаю і прыплоду хатняй жывёлы.

У адпаведнасці з народнымі светапогляднымі ўяўленнямі кожнае «пераходнае» свята бачылася новай магчымасцю тямнічага дыялогу чалавека з Космасам, які быццам бы адкрываў Нябёсы і даваў людзям магчымасць пагартаць некаторыя старонкі сваёй Кнігі Жыцця. Старанавагодняя ноч не была ў гэтым плане выключэннем, таму актыўна выкарыстоўвалася моладдзю, і перш за ўсё, дзяўчатамі, для самых неверагодных варожбаў. Але ў цэнтры ўвагі, канешне ж, былі замужжа і пошукі суджанага. Існавалі такія варыянты варожбаў, якія дапамагалі даведацца, з якога боку будзе жаніх, з багатай ці беднай сям'і, які ў яго будзе характар, імя і нават знешні выгляд (варожба з дапамогай двух люстэркаў).

Яшчэ раз звернем увагу на тое, што як навагодняя, так і старанавагодняя вячэра і паводзіны людзей мадэліравалі жыццёвы шлях сям'і на ўвесь год. Якраз таму гаспадыні і ўсе дамачадцы прытрымліваліся некаторых правілаў:

- Другая куцця — Багатуха, таму «без парсюка й Каляды не Калядамі. Старыя людзі нават гаварылі, што даўней нашы продкі абавязкова перад Калядамі калолі кормнага падсвінака, каб Каляды не гневаліся, да далі на ўсё добры ўраджай, а на говяда харошы прыплод».
- Лічылася, калі гаспадыня напячэ перад Новым годам бліноў, то ў яе гаспадарцы скаціна будзе «гладкай» (здаровай).
- У кашу, прыгатаваную на Шчодрую куццю, гаспадыня клала пярсцёнак. Калі на пачатку вячэры яго зачарпне гаспадар, то ўвесь год сям'я будзе жыць багата.
- У гэты вечар стараліся есці вельмі акуратна, каб нават крошкі не сыпаліся. Акрамя таго, хлеб наразалі і на заўтрашні дзень. Гэтыя рытуальныя дзеянні маглі паспрыяць таму, што члены сям'і на працягу года не будуць рэзаць рук.
- «Хто перад Калядамі жывёлу добра дагледае, той перад Вялікаднем за хвост не падымае». Гэта азначала, што і хатняя жывёла атрымлівала ў гэты дзень пачастункі.
- Калі ў гэты вечар разаб'ецца які-небудзь посуд, бяда прыб'ецца ў хату.
- Да навагодняй куцці трэба вярнуць усе пазыкі, іначай на працягу ўсяго года з пазык не вылезеш.
- Сённяшнім сучаснікам хочам параіць вечарам гэтага дня да захаду сонца вынесці з хаты навагоднюю ёлку, якую усталёўвалі ў апошнія дні снежня, каб «вынесці» ўсю адмоўную энергетыку, якую яна збірала ў хаце на працягу двух тыдняў.
- Любыя навагоднія лішкі і нястачы, спакой і спрэчкі ды іншае паказваюць на тое, што чакае чалавека на працягу года: "З чым застаў чалавек Новы год — з тым ён застанецца да канца».

**Янка КРУК,**
**Аксана КАТОВІЧ.**

## Дзве даты

## 12 студзеня

**1862 год** — 145 гадоў таму на Гродзеншчыне стала выдавацца першая нелегальная рэвалюцыйна-дэмакратычная газета на беларускай мове «Мужыцкая праўда». Выдавалася К. Каліноўскім, В. Урублеўскім, Ф. Ражанскім, С. Сангіным. Вызначалася вострым сацыяльным накірункам і праводзіла ідэю ўсеагульнай барацьбы за лепшае жыццё беларусаў. Усяго да 1863 года выйшла 7 нумароў.



**1793 год** — Расія і Прусія дамовіліся аб другім падзеле Рэчы Паспалітай.

## Цытата дня

**«Калі лёс ставіць табе палкі ў колы, ломяцца толькі гнілыя спіцы».**

## Усміхнёмся!

**Нішто так не ўпрыгожвае стол, як петарда ў аліўе!**

☺

*Размаўляюць дзве сяброўкі:*
*— Ты што свайму на Новы год падарыла?*
*— Блакітную норку.*
*— А ён табе?*
*— Рыбалоўныя снасці.*

☺

**Надпіс на дзвярах тэрапеўта: «Хворых, якія чакаюць прыёму, просім не дзяліцца адзін з адным сімптомамі сваіх хвароб — гэта робіць цяжкім пастаноўку дыягназу».**

☺

*— Рабіновіч хоча ў мяне грошай пазычыць. Не ведаю, ці варта яму даваць?*
*— Абавязкова дай!*
*— Чаму «абавязкова»?*
*— Інакш ён у мяне папросіць...*

☺

**— Нягоднік ты! Усё жыццё на цябе патраціла! Усю маладосць мне сапсаваў!**
**— Маша, хопіць размаўляць з дыпломам...**

## Запрашальнік

# Прысвячэнне Песняру

**12 студзеня 2007 года Уладзіміру Мулявіну, стваральніку і кіраўніку ВІА «Песняры», споўнілася б 66 гадоў. Сёння ў Белдзяржфілармоніі адбудзецца канцэрт «Спяваю і слухаю», прысвечаны памяці Уладзіміра Георгіевіча. У рамках мерапрыемства пройдзе таксама прэзентацыя дыска «Уладзімір Мулявін. Голас душы. Частка першая. Нерастыражыраванае» — першага з серыі пласцінак, якія плануецца выпусціць.**

У канцэрце «Спяваю і слухаю» возьмуць удзел сапраўды знакавыя артысты і калектывы: на сцэну да вядучай вечара Алены Спірыдовіч падымуцца народны артыст СССР і Беларусі кампазітар Ігар Лучанок, народныя артысты Беларусі Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч, народны артыст Беларусі, заслужаны артыст Расіі Уладзімір Гасцюхін, кампазітар Алег Молчан, заслужаны артыст Беларусі Уладзімір Ткачэнка, заслужаны харэаграфічны ансамбль «Харошкі», ансамбль народнай музыкі «Бяседа», вакальны гурт «Чысты голас». Акрамя таго, свой талент у гонар галоўнага «Песняра» падораць слухачам Пётр Ялфімаў, Ксенія Сітнік і Андрэй Кунец, канцэртны аркестр Рэспубліканскага музычнага каледжа пры Беларускай акадэміі музыкі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**Усходні гараскоп на наступны тыдзень**

# РЫБАМ ВАРТА ЗАНЯЦЦА ЛІТАРАТУРНАЙ ТВОРЧАСЦЮ, А АВЕНАЎ ЧАКАЮЦЬ КАР'ЕРНЫЯ ЎЗЛЁТЫ



**АВЕН.** Раптоўныя кар'ерныя ўзлёты здараюцца, на жаль, даволі рэдка, аднак зараз можна чакаць і не такіх цудаў. Праверце: магчыма ў вас атрымаецца заняць месца, якое вызвалілася. У сераду пастарайцеся зразумець блізкіх людзей, знайдзіце кампраміснае рашэнне. У пятніцу зможаце акунуцца ў цудоўную атмасферу свята і ажыццявіць мары. У нядзелю будзьце асабліва асцярожнымі з новымі ідэямі і павевамі.

**ЦЯЛЕЦ.** Не перабольшвайце свае магчымасці і не разлічвайце на сур'ёзную дапамогу збоку. Лепш нават крыху знізіць патрабаванні да сябе — у гэтым выпадку вы зможаце пазбегнуць расчаравання і канфліктаў. Тым больш, што асноўную задачу выканаць удасца, а з дробязямі можна справіцца пасля. У аўторак не спрабуйце будаваць якія-небудзь сур'ёзныя планы, бо ўсе яны будуць парушаны. У выходныя дні не бойцеся шчырасці ў размовах з блізкімі людзьмі, бо вас абавязкова выслухаюць і дапамогуць знайсці рашэнне пытанняў і праблем.

**БЛІЗНЯТЫ.** У пачатку тыдня вам напэўна захочацца прыдумаць штосьці новае і дабіцца, чаго жадаеце, самымі экстравагантнымі спосабамі. Толькі не цягніце час, бо другая палова тыдня не спрые для такіх дзеянняў. Вы зможаце дакладна ўсвядоміць, што перашкаджае вашаму духоўнаму росту і развіццю, а гэта, у сваю чаргу, дазволіць скарэктаваць негатыўныя рысы характару. У станоўчы бок будуць змяняцца адносіны да сяброў і калег.

**РАК.** Можа адбыцца пераход да новага, больш спрыяльнага для вас жыццёвага цыкла. Абвострыцца інтуіцыя — нават можа прысніцца прарочы сон. Вы з куды большым поспехам будзеце вырашаць чужыя праблемы, чым свае асабістыя, вось імі і займіцеся. У аўторак не варта слепа давяраць мяркаванню навакольных, нават калі яны з'яўляюцца для вас аўтарытэтам. Да выхадных дзён прывядзіце ў парадак сваю знешнасць, бо верагодны шматабяцаючыя знаёмствы.

**ЛЕЎ.** Не тое, каб удача ад вас адвярнулася — проста цяпер яе ўсмешак давядзецца дабівацца працай. У аўторак не рабіце паспешлівых высноў — асабліва на падставе плётак. У гэты дзень вас могуць уцягнуць у службовы канфлікт. У суботу вам давядзецца займацца гаспадарчымі пакупкамі ці прыбіраць у кватэры. Нядзеля спрыяльная для заключэння пагадненняў у нефармальных абставінах.

**ДЗЕВА.** Цяжар праблем, якія засталіся з мінулага тыдня, вы зможаце скінуць ужо да серады — і будзеце гатовыя да рашэння новых задач. Творчы настрой дазволіць здзівіць свежымі ідэямі сяброў і калег. Серада — напружаны, але канструктыўны дзень, хоць інфармацыю, якая вас цікавіць, знайсці будзе вельмі складана. Будзьце больш цярплівымі і не адмаўляйцеся ад дапамогі. Пазбягайце двайной гульні, не забывайцеся, што ўсё тайнае рана ці позна становіцца яўным. У чацвер пажадана знайсці аднадумцаў, якія падтрымліваюць вашы ідэі і погляды. Памылкі і непаразуменні, якія здольныя прывесці да канфліктаў, лепш выпраўляць не зыходзячы з месца. Не варта баяцца выглядаць тупа — значна горш будзе запусціць нязначную праблему і ўзрасціць яе да памераў усяленскай. Старайцеся выкарыстоўваць вашу энергію ў стваральных мэтах, бо разбурэнне ўдачы не прынясе. Вас будуць падтрымліваць блізкія людзі, што дазволіць адчуць упэўненасць і спакой. У канцы тыдня не губляйце час і сілы на дробязі, засяродзьцеся на адным-двух пытаннях.

**ШАЛІ.** Перыядычна давядзецца пераробліваць частку спраў, вяртацца да адкладзенага з-за неспрыяльных абставінаў. Неабходна сканцэнтравацца, каб накіраваць падзеі ў патрэбнае рэчышча. Пастарайцеся захоўваць лагічную паслядоўнасць у дзеяннях. Далёка не ва ўсім, што будзе адбывацца ў непасрэднай блізкасці ад вас, варта ўдзельнічаць. У канцы тыдня могуць узнікнуць праблемы з дзецьмі.

**СКАРПІЁН.** Важна ўзабрацца на трон і ўтрымліваць гэта дасягненне, але толькі не любой цаной. Праявіце асцярожнасць — магчымы інтрыгі ў вас за спіной. Прысвяціце дастаткова часу свайму дому, стварыце ў ім утульную абстаноўку. У нядзелю ў вас з'явіцца шанц арганізаваць выдатнае свята для ўсёй сям'і ці для калектыву — і не забудзьце на маленькія падарункі для кожнага.

**СТРАЛЕЦ.** Варта акумуляваць такія якасці свайго характару, як разважнасць і пільнасць. Пажадана пасачыць за сваімі выказваннямі: залішняя балбатлівасць нікому яшчэ не прыносіла карысці. Нестандартны падыход да рашэння праблем дасць станоўчы вынік. У сярэдзіне тыдня не варта рабіць вымову падначаленым толькі з-за таго, што яны не змаглі выканаць якісьці з падпунктаў вашага плана. Галоўная задача выхадных дзён заключаецца ў абароне свайго прыватнага жыцця ад чужых вачэй.

**КАЗЯРОГ.** Вашы планы паступова пачынаюць рэалізоўвацца. Пастарайцеся разабрацца з тымі справамі, якія ў вас назапасіліся, пакуль вы іх адсоўвалі на заўтра — інакш з тым нарастаючым камяком цяжка будзе справіцца. Работа займае дастаткова шмат часу, але па значнасці яна лідзіраваць не будзе. Сваёй энергічнасцю і актыўнасцю вы зможаце умацаваць свае пазіцыі. Не забывайце на свой дом: навядзенне парадку і стварэнне камфорту ў ім — таксама немалаважная задача.

**ВАДАЛЕЙ.** Практычна ўвесь тыдзень будзе прысвечаны рабоце і дзелавым кантактам. Вы адчуеце сябе ў самай гушчы падзей яшчэ з пачатку тыдня. Ён у цэлым спрыяльны для тайных спраў, рэалізацыі задуманага, а таксама вядзення хатняй гаспадаркі. Поспех у прафесійнай дзейнасці будзе спадарожнічаць вам, калі вы падыдзіце да работы з разумным кансерватызмам і вернасцю старым звычкам. Сітуацыя павінна стаць дакладна-спрыяльнай да канца тыдня, што знойдзе канкрэтнае выражэнне ў росце матэрыяльнага дабрабыту. У панядзелак старайцеся адсочваць усе падзеі, якія з вамі адбываюцца. Не губляйце з віду нават дробязі, бо памылкі могуць адбіцца на вашых узаемаадносінах з начальствам. У сераду будуць удалымі перамовы з дзелавымі партнёрамі. Калі будзеце пазбягаць мітусні і дробязнасці, то поспех вам гарантаваны.

**РЫБЫ.** Давядзецца разлічваць толькі на асабістыя сілы. Перамены, якія адбудуцца ў гэты перыяд вашага жыцця, могуць паўплываць на бліжэйшую будучыню. Калі будзеце больш настойлівымі і мэтанакіраванымі, то зможаце дабіцца поспеху ў кар'еры. Вельмі ўдалымі могуць быць заняткі літаратурнай творчасцю і палітычнай дзейнасцю. Успрыміце сур'ёзна новае знаёмства: ад гэтага чалавека будзе прыходзіць вельмі важная для вас інфармацыя. Рыхтуйцеся прымаць важныя рашэнні, каб пазбегнуць вельмі непрыемнай канфліктнай сітуацыі.

## НАРОД ЗАЎВАЖЫЎ

**СТУДЗЕНЬ**

**13 студзеня.** *Васілёў вечар.* Калі ўначы вецер дзьме з поўдня — год будзе цёплым і ўдалым, з захаду — да багацця малака і рыбы, з усходу — чакай ураджаю садавіны.

**14 студзеня. Новы год. Васіль Вялікі.** Зіме сярэдзіна. Калі будзе туман — да ўраджаю.

**19 студзеня.** *Вадохрышча.* Калядныя маразы. Калі мяцеліца, то быць ёй і праз тры месяцы. Калі дзень цёплы — хлеб будзе цёмны (густы); калі халодны, ясны — лета будзе сухое; калі пахмурны і снежны — чакай вялікага ўраджаю. Вадохрышча пад поўны месяц — быць вялікай вадзе. Сабакі шмат брэшуць — будзе шмат дзічыны.

**21 студзеня.** *Емяльян зімовы.* Вызначаюць характар зімы канчаткова. Калі надзьме з поўдня — будзе навальнічнае лета.

**23 студзеня.** *Рыгор Летапаказальнік.* Калі шэрань на дрэвах і стагах — да мокрага і халоднага лета.

**24 студзеня.** *Фядотава цяпло.* Калі цёпла — значыць на раннюю вясну пайшло.

**25 студзеня.** *Тацццянін дзень.* Прагляне сонейка — да ранняга прылёту птушак, снег — лета дажджлівае.

**28 студзеня.** *Пётр-Павел дня прыбавіў.* Калі вецер — будзе год мокры.

**31 студзеня.** *Апанас Ламанос.* Апанасавы маразы. Ламанос марозіць нос. Вароны лятаюць і кружаць чарадой — да марозу.

## ЗАХАВАЕМ УРАДЖАЙ

Каб не адбылося псавання ўраджаю, які з такой цяжкасцю быў вырашчаны на ўчастку, трэба рэгулярна кантраляваць тэмпературу і вільготнасць паветра ў сховішчах. Для многіх гатункаў яблыкаў аптымальныя лічацца тэмпература захоўвання ад 0 да +2—+3°С і вільготнасць паветра 85—90 працэнтаў. Яблыкі пачынаюць замярзаць ужо пры тэмпературы мінус 1,4—1,8°С, таму, калі чакаюцца моцныя маразы, трэба ўцяпліць памяшканне, шчыльна закрыць усе адтуліны.

Можа здарыцца так, што ў сховішчы будзе занадта цёпла, і тады плады пачнуць перасяпяваць і вянуць (калі там залішне суха). Каб пазбегнуць гэтага, сховішча трэба асцярожна праветрываць. Плады, якія пачалі загніваць, неабходна адразу ж выдаляць, каб папярэдзіць далейшае распаўсюджванне псавання.

Трывожны знак — з'яўленне мушак у памяшканні, дзе захоўваецца прадукцыя, у тым ліку ў кватэры. Гэтыя насякомыя пасяляюцца звычайна на раслінай прадукцыі, якая гніе. Змесціва сховішча трэба перабраць, каб знайсці ачаг гнілі.

Выяўленыя захварэўшыя караняплоды ці цэлыя ачагі паражэння неабходна асцярожна выдаліць. Мэтазгодна выняць і непашкоджаныя караняплоды і плады, якія ляжалі побач: яны могуць быць заражаны ці проста запэцканы гніллю. Калі ў скрыні ўжо ўтварылася белая ці шэрая гніль, усё змесціва лепш выкінуць. Выкарыстоўваць гнілыя караняплоды ў ежу нельга, нават калі яны сапсаваныя часткова, бо ў такім выпадку плод усё роўна празаны таксінамі плесені.

# Крынічка

*«Цякла тут з лесу невялічка*
*Травой заросшая крынічка».*
*Якуб КОЛАС.*

*Рубрыку вядзе Валянціна Шпілеўская, тэл. 285-88-81*

№ 1 (219)

## АХОЎНІКІ РАСЛІН

**Неабходна ствараць спрыяльныя ўмовы для насякомаедных птушак, якія знішчаюць шкодных насякомых — шпакоў, мухаловак, папаўзняў, ластавак, вераб'ёў, сітавак. Кожная птушка ў час выкармлівання птушанят прыносіць у гняздо да 1000 насякомых за дзень. Так што можаце ўявіць, ад якой колькасці шкоднікаў будзе пазбаўлены ваш участак.**

Увосень, з надыходам халадоў, трэба вывешваць сінічнікі, каб птушкі, хаваючыся ад непагадзі, прывыклі і заставаліся ў домiках вясной і летам для гнездавання.

Каб птушкі ўвосень і зімой з задавальненнем прылятали на ваш участак, дастаткова змайстраваць ім кармушку, выкладваючы на яе насенне сланечніка, крошкі хлеба (толькі не чорнага — ён выклікае ў іх панос і птушкі слабеюць, можа ўвогуле загінуць), на вяровачцы павесіць кавалачкі несалёнага сала, якое любяць вялікія сініцы і папаўзні.

У гарачы летні час птушкам патрэбна вада. Там, дзе зімой была птушыная сталоўка, наладзьце паілку для птушак. Калі туды кожны дзень будзеце наліваць свежую ваду ды яшчэ побач прымайструеце ваннач-ку для купання, то ўсё лета вашымі жаданымі гасцямі будуць гарыхвосткі, мухалоўкі, валасянкі.

Прыцягвайце на ўчастак яшчарак і жаб, бо яны не грэбуюць нават тымі насякомымі, якіх не чапаюць птушкі з-за іх яркай афарбоўкі ці непрыемнага паху.

Для жаб любімае асяроддзе — вада, таму наладжвайце спецыяльныя вадаёмы, закопваючы ў зямлю старыя тазікі і ванначкі, а калі вакол такіх сажалак высадзіць дэкаратыўныя кусцікі і кветкі, то атрымаецца ўтульны куток.

Ахоўвайце божых каровак, асабліва жука з сямю кропкамі на надкрыллях. Гэты жучок — сямікропачная божая кароўка, а таксама яго лічынка, знішчаюць рознага роду тлю.

## ЯГО ВЯЛІКАСЦЬ ЧАСНОК



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мабыць, няма сярод агародніны таго выпадку, калі б пра гэты прадукт гаварылі з пашанай адны і так «на дух» не пераносілі б іншыя.Часнок — гэта ежа, якая выкарыстоўваецца як лякарства, і лякарства, выкарыстоўваемае як ежа. Ніводная кухня свету не абыходзіцца без часнаку, кажуць, асабліва яго вітаюць французы і кітайцы. Але калі ўспомніць стравы італьянскай ці іспанскай кухні, то народы менавіта гэтых краін маглі б пасрачацца, хто больш за іншых любіць гэты прадукт. У Кітаі яго называюць «зубам дракона». І, на думку вучоных, менавіта таму ўзровень захворвання на рак у гэтай краіне адзін з самых нізкіх на планеце.

Цыбуліны часнаку багатыя на цукрыды. Утрыманне аскарбінавай кіслаты ў іх 8—10 мг, у лісцях — да 50 мг. Спецыфічныя смак і пах, а таксама моцнае бактэрыцыднае дзеянне часнаку надае эфірны алей, колькасць якога залежыць ад ступені спеласці цыбулін, гатунку і ўмоў вырошчвання. У часнаку змяшчаецца многа соляў калію і мікраэлементаў ёду, магнію, фосфару і інш. У лісцях часнаку выяўлены вітамін Е, бета-каранцін і іншыя вітаміны і правітаміны. У цыбулінах знаходзіцца значная колькасць нікацінавай кіслаты — вітамін РР.

Вучоныя Беларускага навукова-даследчага інстытута агародніцтва вось як характарызуюць гэту расліну.

Азімы часнок больш зімастойкі, больш востры на смак, вызначаецца павышаным утрыманнем эфірнага алею, ён таксама больш прадуктыўны: акрамя цыбулін, што растуць у зямлі, дае яшчэ ўраджай паветраных цыбулін, якія з'яўляюцца каштоўным пасадачным матэрыялам. Іх можна таксама выкарыстоўваць для кансервавання і засолкі гародніны. У хатніх умовах азімы часнок захоўваецца да лютага—сакавіка.

Вельмі добрым папярэднікам для часнаку з'яўляюцца ўсе гарбузовыя культуры: агуркі, кабачкі, патысоны, гарбузы, а таксама радыска, салата, сталовыя караняплоды, дзялянкі, пад якія ўносіліся арганічныя ўгнаенні. Участак, які выкарыстоўваўся пад бульбу, для часнаку не прыгодны, таму што ў такім выпадку часнок у большай меры паражаецца фузарыёзам і нематодай. Часнок лепш за ўсё вырошчваць на градках вышынёй 15—20 см і ў шырыню 1 м. Такія градкі добра праграваюцца сонцам. А ў глебе ствараецца спрыяльны водна-паветраны рэжым. Градкі, а таксама грабяні, вышыня якіх 25 см і шырыня 30 см, выкарыстоўваюцца на сырых участках, а таксама з блізкім стаяннем грунтовых вод, цяжкімі глебамі (гліністымі і суглінiстымі).

Часнок вельмі добра рэагуе на арганічныя і мінеральныя ўгнаенні, таму пры асенняй апрацоўцы глебы (калі папярэдняй культуры не ўгнойваліся арганікай) пад яго ўносяцца 5—6 кг на кв. м добра перапрэлага гною, перагною ці добра вытрымана кампосту. Свежы гной пад часнок уносіць не рэкамендуецца. Калі пад папярэднюю культуру ўносяцца гной конскі ці каровін (6—8 кг на кв. м), свіны (4 кг на кв. м), птушыны памёт (1,5 кг на кв. м), то можна абмежавацца мінеральнымі ўгнаеннямі. З мінеральных прымяняюць суперфасфат (30—40 г на кв. м) і хлорысты калій (15—20 г на кв. м). Азотныя ўгнаенні ўносяцца вясной. Пасля ўнясення арганічных і мінеральных угнаенняў участак старанна перакопваюць на глыбіню 20—25 см, раўнамерна перамешваючы ўгнаенні з глебай. Кіслую глебу вапнуюць (на 1 кв. м уносяць 300—400 г вапны).

## ТАННЫЯ ЎГНАЕННІ

**Пілавінне — адзін з самых танных арганічных матэрыялаў, прыгодных для паляпшэння ўрадлівасці глебы. У звычайным выглядзе іх не прымяняюць, таму што свежае пілавінне багата на вугляводы і пры непасрэдным унясенні ў глебу выклікае бурнае развіццё мікраарганізмаў, якія паглынаюць з той жа глебы для сваёй жыццядзейнасці вельмі многа мінеральнага азоту.**

Найбольш правільны і эфектыўны шлях выкарыстання пілавіння — гэта кампаставанне ў сумесі з іншымі матэрыяламі. Кампост з перапрэлым у ім пілавіннем значна паляпшае структуру глебы, робіць яе паветрапранікальнай і вільгацяёмістай. Кампосты з драўніннага пілавіння, асабліва хваёвых парод і дуба, перапраўляюць значна даўжэй, чым з пілавіння бярозы ці асіны. Каб паскорыць працэс біялагічнага гарэння (гніення), перад закладкай кампосту неабходна добра змачыць драўніннае пілавінне вадой, гноевай жыжкай, разбаўленымі ў вадзе фекаліямі ці кухоннымі адходамі, а таксама змяшаць іх з апалым лісцем дрэў, бульбоўнікам, бацвіннем памідораў, агуркоў ці іншых раслін. Акрамя гэтага, карысна дадаваць у пілавінне зямлю па 2—3 вядры на кв. м. Тады ў кампосце з драўніннага пілавіння будуць хутка размнажацца гноевыя чэрві і мікраарганізмы, якія паскараюць працэс гніення драўніны.

На працягу лета кампост з драўніннага пілавіння карысна пералапачваць праз кожныя паўтара месяца і пры гэтым запраўляць раслiннымі рэшткамі, якія збіраюцца на ўчастку, а таксама мінеральнымі ўгнаеннямі, як напрыклад, нітрафоскай з разліку 1,5 кг на кв. м кампосту.

## Сёння

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.23 | 16.13 | 7.50 |
| Віцебск — | 8.19 | 15.56 | 7.37 |
| Магілёў — | 8.13 | 16.03 | 7.50 |
| Гомель — | 8.02 | 16.07 | 8.05 |
| Гродна — | 8.37 | 16.29 | 7.52 |
| Брэст — | 8.29 | 16.37 | 8.08 |

**Месяц**

*Апошняя квадра.*
*Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

**Імяніны**

**Пр.** *Марыі, Давіда, Іосіфа, Макара, Якава;*
**К.** *Тацццяны, Чаславы, Аркадзя, Банядзікта, Бярнарда, Часлава.*

## Надвор'е на заўтра




## ...у суседзяў

| | | | |
|---|---|---|---|
| ВАРШАВА | +10 — +12 °С | МАСКВА | +2 — +4 °С |
| ВІЛЬНЮС | +6 — +8 °С | РЫГА | +6 — +8 °С |
| КІЕЎ | +6 — +8 °С | С-ПЕЦЯРБУРГ | +1 — +3 °С |

ПРУП «Зеленоборское» Смолевичского района

**ОБЪЯВЛЯЕТ ТЕНДЕР**

**на выполнение работ под ключ по проекту «Реконструкция систем тепло- и электроснабжения ПРУП «Зеленоборское» с применением газопоршневых электростанций».**

*Тендерные предложения принимаются в течение 10 дней с момента опубликования объявления.*

**Телефоны для справок: 8-01775-25650, 25651, 25659.**



*Ад усёй душы віншуем з днём нараджэння цудоўнага сем'яніна, добрага таварыша, прафесіянала сваёй справы* ***ВАСІЛЕВІЧА Канстанціна Мікалаевіча!*** *Жадаем моцнага здароўя, шчасця, добрага настрою, міру, дабра і здзяйснення самых запаветных жаданняў.*

**Родныя, сябры і калегі па працы.**

Считать **недействительной квитанцию** СООО «Белкоопстрах» **1-СУ серии ГС № 5715744.**

Считать **недействительными страховые свидетельства** СООО «Белкоопстрах» ОСГО ВТС **РБ серии АД с № 5030124 по № 5030125.**

Утерянные **страховые полисы** по обязательному страхованию гражданской ответственности транспортных средств на территории РБ представительства ЗАСО «ТАСК» в г. Минске **№ 2 серии АД № 7427610 и серии АД № 7430551** считать **недействительными**.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

**РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.**

**Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.**

**НАШ АДРАС**: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**ТЭЛЕФОНЫ**: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела тэл. — 292-04-52. **html:** www.zvyazda.minsk.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.**

**Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 204. Нумар падпісаны ў 19.30.**

**М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**